№ 38 (348) 17 кастрычніка 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Апазыцыя гатовая ўзяць уладу**
Альтэрнатыўны бюджэт-2004.
старонкі 6–7

**Маленькая вайна пад Баранавічамі**
Як прыходзілі к нам партызаны.
старонка 5

**Асінавы кол для героя**
Эсэ Сяргея Шыдлоўскага.
старонка 15

# Нацыянальны не дзяржаўны



Зьезд лабістаў Беларушчыны.
Старонка 4.

Сяргея Кручкова, Людмілу Дзіцэвіч і Алега Трусава пераабралі кіраўнікамі ТБМ.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Другая Няміга

**Рандзілаўшчыну, дзе ў псыханэўралягічным дыспансэры згарэў у нядзелю раніцай 31 чалавек, даволі цяжка знайсьці. Пачнём з таго, што ажно да lenta.ru адразу дайшло паведамленьне: пажар здарыўся ў Казловіцкім інтэрнаце на Гарадзеншчыне. Беларускія сродкі масавай інфармацыі ўпарта паўтаралі гэта нават у панядзелак. Паленаваліся зазірнуць у даведнікі, узяць мапу. Праўда, пры канцы дня некаторыя "выправілі" памылку: пажар адбыўся ў Казлоўшчыне. Але насамрэч дыспансэр знаходзіцца ў вёсцы Рандзілаўшчына, а паміж ёй і Казлоўшчынай яшчэ стаіць цэнтар сельсавету Дзянісава.**

Аднак гэта яшчэ ня ўсё. Калі даваць веры "Атлясу Гарадзенскай вобласьці", Рандзілаўшчына месьціцца справа ад Казлоўшчыны, г.зн. на ўсход. А вось мапа аўтамабільных дарог выданьня 2002 г. дае адваротныя зьвесткі: Рандзілаўшчына — на захадзе ад Казлоўшчыны. І саму Казлоўшчыну яна разьмяшчае зусім у іншым месцы, ня там, дзе яна знаходзіцца насамрэч. Мы ехалі з поўначы, пераехалі церазь Нёман, мінулі Дзятлава, а далей выявілася, што мапа брэша. Тых вялікіх вёсак, якія былі пазначаныя на шашы Дзятлава—Слонім, мы ня ўбачылі, затое раптам трапілі ў Казлоўшчыну. Мы вырашылі, што мапа аўтамабільных дарог складзеная цалкам у духу антынатаўскіх манэўраў "Чыстае неба". Мэта — заблытаць ворага, каб у будучыні натаўскія танкавыя калёны трапілі ў рэшткі беларускіх балотаў.

Дарэчы, дарожнага паказальніка з шыльдай "Рандзілаўшчына" таксама не існуе. А ёсьць толькі — "Псыханэўралягічны дыспансэр". У вёсцы засталося жылых хатаў дзесяць. Выглядае яна даволі міла. Спачатку ля дарогі спатыкае капліца ў выглядзе высокага мураванага кантовага слупа з крыжам. Леваруч — касьцёлік у клясычным стылі, каля яго старыя могілкі. Ля касьцёлу прыбіралі жоўтае лісьце сталыя мужчыны і кабеты. Дарога вядзе міма — да былога панскага маёнтку з прысадамі. У ім — установа, што раптам стала вядомая на ўвесь сьвет, хоць і зь пераблытанай назвай.

Міліцыя на тэрыторыю не пускала, але паводзілася досыць міралюбна. Наперадзе было відаць гарэлішча, абнесенае бела-чырвоным пасам. Насельніцы дыспансэру прыбіралі лісьце: напэўна, чакалі Аляксандра Рыгоравіча. Бо ў сельсавеце мы пачулі: можа прыехаць сам Лукашэнка. Але, напэўна, у прэзыдэнцыі ўзважылі плюсы і мінусы магчымага візыту і, мабыць, налічылі мінусаў болей. Дый увогуле, відаць, да сельсавету дайшла запозьненая інфармацыя. Каб Лукашэнку па-сапраўднаму чакалі, дык не пад'ехалі б мы да Рандзілаўшчыны, не размаўлялі б зь міліцыянтамі, з сваякамі хворых, якія прыехалі наведаць сваіх, калі даведаліся пра здарэньне. Не аглядалі б мы кінутыя скрынкі гмахаў — дыспансэр гадоў дзесяць таму пачалі разбудоўваць. У "гарадзкіх" будынках былі б і ўмовы лепшыя. А так — прыбіральня на дварэ, старыя драўляныя, панскія яшчэ дамы, у якіх хворыя жылі... Прычым згарэў самы населены — 62 чалавекі. Усяго хворых у дыспансэры было 134.

Працяг на старонцы 5.

• НАВІНЫ •

## Лукашэнка ня мае шанцаў

**Калі б рэфэрэндум аб зьмене Канстытуцыі, якая б дазволіла А.Лукашэнку балятавацца на трэці тэрмін, адбыўся цяпер,** 51,8% беларусаў адказалі б адмоўна. Паводле апытаньня НІСЭПД, за такія зьмены прагаласавалі б толькі 22,6% выбарцаў.

## Халіп выклікалі ў пракуратуру

**Журналістку "БДГ" Ірыну Халіп выклікалі ў пракуратуру.** Сьледчыя цікавіліся яе артыкуламі ў расейскай "Новой газете" "Садам Хусэйн можа хавацца ў Беларусі?" і "Беларускі блефмэйкер выдае сябе за дзяўчыну". У абодвух фігуруе асоба А.Лукашэнкі. На паперцы з цытатамі з артыкулаў была пазначана лічба 367. Такі нумар у Крымінальным кодэксе мае артыкул аб паклёпе на прэзыдэнта.

## Малітва за гаспадарку

**19 кастрычніка а 15-й у Менску на плошчы Бангалор адбудзецца ўрачыстае набажэнства, прысьвечанае сьвяткаваньню 450-годзьдзя Рэфармацыі ў Беларусі.** У служэньні возьмуць удзел прадстаўнікі ўсіх эвангельскіх дэнамінацыяў Беларусі. У часе службы будуць маліцца за беларускую гаспадарку і беларускіх прадпрымальнікаў.

## Шырак замест Шродэра

**Прэзыдэнт Францыі Шырак у пятніцу выступіць на саміце ЭЗ замест свайго нямецкага калегі Шродэра.** Сам нямецкі канцлер у гэты час мусіць быць на важным галасаваньні ў Бундэстагу. Такая замена адбываецца ўпершыню ў гісторыі й сьведчыць пра поўны давер кіраўнікоў дзьвюх найбольшых дзяржаваў Эўропы.

**СМ**

# "Каза" на рагах

**У нядзелю ў КЗ "Менск" адбываліся дзівосы: Памідораў страляў у Вольскага зь пісталета, па ўсім партэры вальсавала пара, Міхалок вывучыў словы "мэнтальнасьць" і "сьвядомасьць", а Кулінковіч пераўвасобіўся ў Квазімода.**
**Старонка 13.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# За што даюць Нобэля

Самым павучальным зь сёлетніх Нобэляў падаецца прэмія ў фізыцы. Ледзь не паўстагодзьдзя аддзяляюць працу сп.Гінзбурга ад высокае ўзнагароды, нагадваючы, што славутая прэмія ня столькі інвэстыцыя і стымул, колькі ганараваньне. Яна даецца ляўрэату не для таго, каб **ён** працаваў лепей, але каб мелі стымул для старанная працы іншыя.

Прэміі за "сьвежыя" зьдзяйсьненьні (як у гэтым годзе па хіміі) зьяўляюцца час ад часу ў галінах, што разьвіваюцца незвычайна імкліва. На самую блізкую пэрспэктыву гэта, безумоўна, біялягічныя навукі. Прэмія міру можа быць водгукам на надзённыя палітычныя выклікі і нават — згадаем хаця б Андрэя Сахарава — інвэстыцыяй, стымулам і сродкам.

Калі ж глядзець увогуле — і асабліва гэта тычыцца літаратуры, — Нобэлеўская прэмія пазначае сваім "знакам якасьці" тое, што ўжо стала знакамітым на нацыянальным, а то й на глябальным узроўні. Іншы раз — гэтак здарылася ў свой час з Кіплінгам — зорны час ляўрэата мінае задоўга да таго шчасьлівага моманту, калі яго наважацца адзначыць швэдзкія акадэмікі.

Спадзяваньні на ганараваньне Нобэлеўскай прэміяй беларуса падаюцца ў гэтай сувязі малацікавым заняткам. Мы, беларусы (і нават з братняю Русьсю), будзем ведаць гэтага чалавека нашмат раней, чым яго заўважаць у Осла ці Стакгольме. Важнае не ягонае зьяўленьне як такое (ня выключана, што нейкі наш, хутчэй за ўсё былы, суайчыньнік зробіць недзе ў замежным — ці нават і ў нашым — унівэрсытэце эпахальнае адкрыцьцё), а нашая падрыхтаванасьць да ролі нацыі, якая выдае нобэлеўскіх ляўрэатаў. Прызнаймася шчыра — калі б існавала прэмія Нобэля для нацыяў, беларусы сёньня наўрад ці прэтэндавалі б на ўключэньне ў short-list.



REUTERS

### Фізыка

Аляксей Абрыкосаў (ЗША—Расея), Віталь Гінзбург (Расея), Энтані Легет (Вялікая Брытанія—ЗША) — за ўнёсак у тэорыю звышправоднасьці й звышцякучасьці. Прыклад павольнасьці швэдзкіх акадэмікаў: працы Абрыкосава і Гінзбурга ў тэорыі звышправоднасьці датуюцца 50-мі XX ст. Легет зарабіў на прэмію ў 70-я дасьледаваньнямі звышцякучага гелію-3. Сёньня звышправоднасьць ужываецца ў мэдычнай апаратуры ядравага магнітнага рэзанансу.

### Хімія

Процілеглы выпадак: Пэтэр Агрэ і Радэрык МакКінан апублікавалі вынікі сваіх дасьледаваньняў структуры каналаў у мэмбранах клетак жывых арганізмаў пры канцы 90-х. Каналы ў мэмбранах, па якіх у клетку і з клеткі ідуць вада ды іёны соляў, — сапраўдныя машыны з каналамі і кляпанамі памерам у некалькі малекулаў. Каналы забясьпечваюць жыцьцядзейнасьць клетак і дапамагаюць дэталёва зразумець, як яна функцыянуе. Гэта дапаможа адшукаць новыя лекі ад розных захворваньняў.

### Фізіялёгія і мэдыцына

Прэмію атрымалі Пол Лотэрбур з ЗША і Пэтэр Мэнсьфілд зь Вялікай Брытаніі за распрацоўку ў 1970-х мэтадаў візуалізацыі на аснове ядравага магнітнага рэзанансу (ЯМР). Іх тэхналёгіі штогод шырэй і шырэй ужываюцца ў практычнай мэдыцыне і дасьледаваньнях. За год у сьвеце робіцца больш за шэсьцьдзесят мільёнаў дыягнастычных абсьледаваньняў з ужываньнем ЯМР, мэтад дапамагае лепш дыягнаставаць шмат якія захворваньні, перадусім мозгу і хрыбту.

### Літаратура

Джон Максвэл Кутзэе з ПАР, "які ў шматлікіх формах адлюстраваў дзіўную далучанасьць староньняга чалавека".

### Прэмія міру

Шырын Эбадзі, праваабаронца, юрыст і публіцыстка з Ірану. Нарвэскі Нобэлеўскі камітэт спэцыяльна адзначыў ейнае змаганьне за правы жанчынаў і дзяцей, зрабіўшы націск на мусульманскім веравызнаньні ляўрэаткі, ейнай ахвярнасьці, настойлівасьці і здольнасьці існаваць на асабістую рызыку.

### Эканамічныя навукі

Робэрт Інгл з ЗША атрымаў прэмію за мэтады аналізу эканамічных часавых шэрагаў із зьменлівым у часе ўзроўнем флюктуацыяў, а ягоны суайчыньнік Кліў Гранджэр — за мэтады аналізу гэткіх шэрагаў на прадмет наяўнасьці агульнае тэндэнцыі. Працы гэтых навукоўцаў у галіне матэматычнай статыстыкі дазволілі распрацаваць новыя, значна больш дакладныя працэдуры аналізу эканамічнай інфармацыі.

**Даніла Жукоўскі**

БЕЗ КАМЭНТАРОЎ

**Натальля Пяткевіч, прэсавы сакратар кіраўніка дзяржавы, на пытаньне журналіста радыё "Свабода", ці будзе абвешчаная дзяржаўная жалоба па ахвярах пажару ў Рандзілаўшчыне, адказала:** "А вось вы грамадзянін Рэспублікі Беларусі? Як бы вы ўспрынялі, калі б па трыццаці псыхічна ненармальных людзях у краіне абвесьцілі жалобу?..".

## Удачы і пралікі альтэрнатыўнага бюджэту

Прапанаваны альтэрнатыўны бюджэт без усялякіх ваганьняў можна вітаць. Ён лібэральны духам і здаровы зьместам. Праект забясьпечвае празрыстасьць руху фінансавых сродкаў, роўныя для ўсіх умовы падаткаабкладаньня, увядзеньне рэальнага кантролю за распрацоўкай і выкананьнем з боку грамадзтва і парлямэнту. Радуюць вока яснасьць і лягічнасьць мэтодык разьліку асноўных парамэтраў бюджэту. Да таго ж, новы бюджэт не застанецца адрынутым з боку насельніцтва, паколькі лібэральнасьць і прагрэсіўнасьць у ім не абяртаюцца адмаўленьнем прыярытэтнасьці сацыяльных выдаткаў. Нават наадварот. Да сацыяльных адносіцца 67,4% выдаткаў, у той час як у афіцыйным праекце бюджэту — недзе каля 55%.

Аднак зрэалізаваны бюджэт можа быць толькі пры ўмове пасьпяховых і сыстэмных рэформаў.

**Працяг на старонцы 7.**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Мода на левізну



Раней 13 кастрычніка ў ноўтбуку беларускай Кліё значылася як дзень народзінаў вельмі несымпатычнай асобы — Мураўева-вешальніка. У аналы сучаснай гісторыі 13.10.03 можа ўвайсьці як больш сьветлая эпахальная дата: 13 кастрычніка дэндзі з "Маладой грамады", брудныя панкі, анархісты, фанаты стылю "мілітары", мааісты і маладыя лейбарысты дамовіліся аб'яднаць свае рэсурсы для арганізацыі "Беларускага сацыяльнага форуму" — папулярнай ва ўсім сьвеце мадэлі каардынацыі левых. Інтрыга праекту ў наступным.

Створана тусоўка, якая (пры ўмове, што яе айцы-заснавальнікі не забудуцца пра дамову пасьля другога куфля "Аліварыі") можа прэтэндаваць на значны шмат электаральнага пірага. У 60-я гады ў Нямеччыне аналяг такога ж блёку —"Саюз сацыялістычных студэнтаў" — здолеў за некалькі гадоў ахапіць амаль усю студэнцкую моладзь.

Створана тусоўка, якая (калі ня лясьнецца падчас дзялёжкі першага гранту) зможа манапалізаваць левую сцэну, каб не пусьціць туды прайдзісьветаў кшталту ўкраінскага мультымільянэра Медзьведчука. Апошні ад няма чаго рабіць набыў сабе партыю эсдэкаў АСДПУ(а) і запісаў туды ўвесь пэрсанал сваёй імпэрыі, з футбалістамі кіеўскага "Дынама" ўключна. БРСМ адпачывае. Кажуць, аднойчы ружовы барын запатрабаваў, каб Андрэй Шаўчэнка публічна сьпяваў "Інтэрнацыянал", што ледзь не сарвала кантракт бамбардзіра зь "Мілянам". Уладар "чырвона-чорных" Бэрлюсконі, як вядома, жыве за формулай "Best dead than red".

Створана тусоўка, якая (калі яе сябры ня будуць капіяваць звадлівых дарослых палітыкаў) зможа інстытуцыялізаваць новую моду на левізну. Сымптомы новай рашучай зьмены грамадзкіх перавагаў можна заўважыць на кожным кроку. Буйныя камэрцыйныя кампаніі робяць рэклямнымі брэндамі фізіяномію Чэ Гевары. Песьні "Manu Chao" і "Rammstein" не пакідаюць гіт-парадаў. Кіньце погляд на раскладкі кніжных спэкулянтаў: працы левых тэарэтыкаў — субкамандантэ Маркаса, Хакім-бея, Кастардыяса, Хомскага — разьлятаюцца, як цыгарэты ў часы гарбастройкі. У вэбе шырыцца кола прыхільнікаў сыстэмы "Linux", створанай анархістамі для барацьбы з апэтытамі карпарацыі "Microsoft". Фактычна мы можам казаць пра новую каньюнктуру моладзевай моды. Што вельмі важна: пераносчыкамі левай бацылы зьяўляюцца не аўтсайдэры кшталту крэйзанутых бабак-сталіністак і аматараў водкі за 4,20 руб., а цалкам нармальная, часам нават матэрыяльна забясьпечаная моладзь. Рост такіх настрояў будзе толькі павялічвацца адпаведна хуткасьці рынкавых рэформаў Лукашэнкі. Асноўным выклікам найбліжэйшых гадоў для левых стане — ці здольныя яны асвоіць новыя магчымасьці.

Мінулы тыдзень прадэманстраваў, што на шляху росту ўплыву новай беларускай лявіцы зьявіўся незвычайны праціўнік: нарастаючая эксцэнтрычнасьць правых, якія становяцца ўлюбёнцамі мэдыяў. Словы сп.Севярынца ў інтэрвію "Белорусской газете" аб тым, што этас беларускага нацыяналіста не дазваляе яму піць гарэлку, бо яе завезьлі ў краіну "клятыя маскалі", натуральна, больш прывабныя для журналістаў, чым усе левыя маніфэсты аб вольнасьці і братэрстве. Гэта ставіць перад новымі левымі яшчэ больш цынічнае заданьне: не губляючы шыку ў вачах новай сярэдняй клясы, пераплюнуць правых у экстрэмізьме дэкору сваіх акцыяў. Калясальная праблема! Шчыра кажучы, пакуль я ня ведаю, што можна супрацьпаставіць бяздоннай фантазіі апосталаў "Маладага фронту".

**Лёлік Ушкін**

## Пятро Капітула:

# Патрэбныя зьмены ў эканамічнай палітыцы

На навуковай канфэрэнцыі "Праблемы прагназаваньня і дзяржаўнага рэгуляваньня сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця", што прайшла пад эгідай Міністэрства эканомікі і Нацбанку, былы дарадца Аляксандра Лукашэнкі, а цяпер выкладчык Эканамічнага ўнівэрсытэту Пятро Капітула заявіў пра патрэбу рэзкіх зьменаў у эканамічнай палітыцы дзяржавы.

Беларуская мадэль прадугледжвае значную цэнтралізацыю функцый кіраваньня, зазначыў ён. Між тым ніколі дзяржаўная ўласнасьць, дзяржаўнае ўмяшаньне ў эканоміку ня могуць быць эфэктыўнымі, і гэта даказала гісторыя разьвітога сацыялізму. Умяшаньне дзяржавы ў цэнаўтварэньне стрымлівае разьвіцьцё эканомікі. Няма будучыні ў беларускай эканомікі, калі захаваецца такі нізкі ўзровень інвэстыцый у яе, як цяпер, прычым безнадзейна разьлічваць на ўнутраныя крыніцы інвэставаньня. Таксама П.Капітула заявіў, што Беларусі не патрэбны такі маштабны машынабудаўнічы і станкабудаўнічы комплекс — ён выгадны не Беларусі, а Расеі. Адтуль ідуць мэтал, газ, электраэнэргія, наша ж толькі праца. Ён выгадны занятасьцю людзей, але не эканамічна, бо зьядае прорву субсыдыяў. Выснова Капітулы: калі пэўныя вытворчасьці працуюць выключна на расейскі рынак, трэба перадаць іх адпаведным расейскім карпарацыям, каб яны іх і ўтрымлівалі.

**МБ; "Звязда"**

ТРЫБУНА ПАЛІТЫКА

# Адраджэньне Фронту

**На гэтым тыдні спаўняецца пятнаццаць гадоў БНФ. 19 кастрычніка 1988 г. у будынку Чырвонага касьцёлу — на той час Дому кіно — адбылося пасяджэньне арганізацыйнага камітэту Беларускага народнага фронту.**

**Увосень 2003-га *адзіны Народны Фронт* патрэбны Беларусі ня менш, чым тады. Дыктатарскі рэжым, Расейская імпэрыя й слабасьць разрозьненае апазыцыі робяцца франтальным выклікам Беларусі. Адказ пагрозам мусіць быць гэткім самым франтальным.**

### Беларуская ідэя

Першапачатковае пытаньне, зь якім трэба вызначыцца нацыянальным сілам, — Ідэя. На гэты момант беларуская нацыянальная ідэя існуе ў выглядзе разрозьненых і прыватных тэзаў. Агульнапрынятае канцэпцыі дзяржаўнасьці, нацыянальных каштоўнасьцяў і нацыянальных інтарэсаў, прызнанае нават большасьцю суб'ектаў апазыцыі, папросту няма. Не ў апошнюю чаргу гэтымі акалічнасьцямі тлумачыцца разброд у лягеры правых.

Сфармуляванага яшчэ пры канцы 80-х паняцьця *беларускае ідэі* як ідэі незалежнасьці сёньня ўжо недастаткова: вось ужо паўтара году галоўны абаронца сувэрэннасьці ў нас Лукашэнка. Таму зь лёзунгу "моцнае дзяржавы" (выкарыстанага Лукашэнкам дзеля захаваньня ўлады і ўціскаьня грамадзтва) акцэнт пара пераносіць на фармаваньне *моцнае нацыі*. Сьцьвярджаць уласна нацыянальную ідэю: нацыянальную місію, нацыянальных герояў, нацыянальныя інтарэсы. Сыстэмная распрацоўка такое ідэі мае на ўвазе, што праблемы, напрыклад, узроўню жыцьця, наркаманіі або чаўночнага бізнэсу перастаюць разглядацца як выключна сацыяльныя і фармулююцца як нацыянальныя. Такім чынам, правыя выходзяць зь межаў вузкага стэрэатыпу "змагароў за мову і культуру" на прастор масавае сьвядомасьці з адстойваньнем інтарэсаў "беларускага чалавека": беларускага грамадзтва, беларускага бізнэсу, беларусаў за мяжой. Такая ідэя мусіць мець фундамэнтальнае сьветапогляднае апірышча, і відавочна, што для Беларусі ў яе гісторыі, сучаснасьці й эўрапейскім кантэксьце

# Паўраспад на шляху яднаньня

**Развод Вячоркі і Севярынца, якога з трывогаю чакалі актывісты нацыянальнага руху, прайшоў ціха і інтэлігентна. Ці прывядзе ён да новых хаўрусаў?**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Вінцук Вячорка: "Хлопец зрабіў свой выбар".**

Усё абышлося безь вялікага скандалу. Перад пачаткам Павал Севярынец, раздаўшы журналістам ды ўдзельнікам сойму сваю заяву пра выхад з партыі, сышоў з офісу. І гэтым задаў сойму тон: нават абмеркаваньне заявы пра тое, што ўлады распальваюць у краіне міжэтнічную варожасьць, зьвялося ўрэшце да Севярынца. Прыкладамі распальваньня варожасьці ў заяве названыя папярэджаньні Саюзу палякаў у Беларусі, антысэміцкія захады ўлады (закрыцьцё Міжнароднага гуманітарнага інстытуту пры БДУ), вайсковыя вучэньні "Чыстае неба" (паводле іх сцэнару, кампактная этнічная меншыня імкнецца аддзяліцца ад "Чырвонай Рэспублікі" пад правакацыйным уплывам суседняй "Сіняй Рэспублікі", пры гэтым "сінія" выкарыстоўваюць здраду ўнутранае апазыцыі "чырвоных"). Сойм у сваёй заяве адзначыў, што вучэньні бачаць патэнцыйнага праціўніка ў Польшчы, Літве, Латвіі ці Украіне і адпаведных этнічных мяншынях у Беларусі.

Правакацыяй сойм палічыў і публікацыю ў "Белорусской газете" інтэрвію з палітолягам Андрэем Суздальцавым пра ўціск расейскай дыяспары ў Беларусі. Зарабіў і Севярынец, які "паддаўся на правакацыю" і дыспутаваў з Суздальцавым, кажучы пра "фіна-вугорскія гены ў расейцаў, празь якія яны схільныя да алькагалізму". Філіпікі былі завочныя: на сойме Павал не прысутнічаў. У ягонай заяве пра выхад з партыі сказана, што БНФ, такі, які ён ёсьць сёньня, ня мае будучыні, бо адышоў ад ідэяў Адраджэньня і ня мае шанцаў стаць шырокім грамадзкім рухам. Ёсьць і закіды кіраўніцтву партыі ў партыйных чыстках ды "атмасфэры нецярпімасьці й фарысэйства". Севярынец заклікаў да супрацоўніцтва ўсіх сяброў партыі, "гатовых змагацца за Беларусь".

Вячорка ў адказ зьвінаваціў Севярынца ў парушэньні партыйнага статуту: маладафронтаўцы, маўляў, працуюць валанцёрамі ў Расеі на выбарах у Думу на Саюз правых сілаў, які выступае за ўвядзеньне расейскага рубля ў Беларусі.

Юры Хадыка заявіў, што ў выпадку галасаваньня ён быў бы супраць выгнаньня Паўла з партыі: "Іншадумцы паўсюль патрэбныя". Лякалічна падтрымаў Севярынца і прадстаўнік Магілёва Анатоль Фёдараў: "Павал правільна сказаў". Вячорка абазначыў сытуацыю сьцісла: "Паўлу прапанавалі выбіраць, каго ён хоча прадстаўляць — Партыю БНФ ці "Малады фронт". Хлопец зрабіў свой выбар". Мелася на ўвазе тое, што Севярынец, сябра БНФ, ад імя "Маладога фронту" вёў перамовы зь "пяцёркай" дэмакратычных партыяў, у якую ўваходзіць і Фронт.

Знаходжаньне БНФ у "пяцёрцы" разам з камуністамі моцна недаспадобы Севярынцу. Супраць удзелу ў любых такіх кааліцыях выступае і Зянон Пазьняк. На ягоную думку, яны могуць толькі зьнізіць аўтарытэт БНФ. Маладафронтаўцы з кахэпістамі, ужо аб'яднаныя супольным змаганьнем у Курапатах, цяпер могуць сысьціся яшчэ шчыльней. Да гэтае новае сілы маглі б далучыцца і актывісты незарэгістраванае Партыі свабоды, а таксама сябры БСДГ ды БНФ, якія стаяць на больш радыкальных пазыцыях, чым лідэры. Ці створыцца такая новая кансэрватыўна-хрысьціянская кааліцыя, залежыць ад гатоўнасьці Пазьняка, Севярынца, а таксама Вячаслава Сіўчыка, Уладзімера Кабца ды Сяргея Высоцкага прыйсьці да паразуменьня. Але рэальна, а не на паперы такая кааліцыя запрацуе толькі ў тым выпадку, калі гэтыя палітыкі знойдуць кантакт з рэгіянальнымі лідэрамі, што могуць прывесьці ў яе актывістаў і адшукаць крыніцы фінансаваньня. Згуртаваць можа толькі супольнае дзеяньне, тым часам погляды самых яркіх правых лідэраў на найбуйнейшую палітычную кампанію наступнага году разыходзяцца. Лідэры моладзі Севярынец, Кобец, Высоцкі гатовыя да ўдзелу. Пазьняк катэгарычна супраць. Што ў такім разе магло б стаць плятформаю новага палітычнага аб'яднаньня, невядома. Між тым, як паказвае досьвед мінулых гадоў, менавіта бязьдзеяньне, адсутнасьць канкрэтных справаў пры збытку амбітных лідэраў вядзе да застою, за якім надыходзіць унутраны крызыс. Таму пытаньне, ці адбудзецца "нацыянальная кааліцыя", застаецца адкрытым.

Зрэшты, і з "дэмакратычнай пяцёркай", як вынікае з словаў Вячоркі, пакуль ня ўсё гладка. Гэта не партыйны блёк, не нават кааліцыя — проста міжпартыйная ініцыятыва: удзельнікі яе пагадзіліся, што супольныя для ўсіх прынцыпы — гэта дэмакратыя і незалежнасьць краіны. Усе астатнія пазыцыі не абмяркоўваюцца. Так што "Фронт ідзе на выбары пад сваім імем, з сваімі ідэямі, ні ад кога не хаваючыся", — кажа Вячорка.

Кіраўніцтва БНФ, зьвінавачанае Севярынцам у ігнараваньні інтарэсаў МФ і Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі, прапанавала апошняй аб'ядноўвацца намаганьні ў падрыхтоўцы Дзядоў. Але пра аб'яднаньне партыяў гаворка ня йдзе. "Як мы можам аб'ядноўвацца сёньня з КХП-БНФ, калі яны не прызнаюць парлямэнцкіх выбараў, а мы на іх ідзём?" — пытаўся на сойме Вінцук. Вось жа, нацыянальныя сьвяты й даты — пакуль што галоўны аб'ядноўчы чыньнік у дачыненьнях між партыямі, што прэтэндуюць на адлюстраваньне інтарэсаў людзей беларускамоўных. "Калі нават КХП не захоча, дык мы папросту без скандалу далучымся да мерапрыемстваў, ладжаных гэтай партыяй", — сказаў прэссакратар БНФ Аляксей Янукевіч. Маладафронтаўцы, трэба думаць, далучацца таксама.

**Аркадзь Шанскі**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

ролю сыстэмы каардынатаў выконвае хрысьціянства, поліканфэсійнае й талерантнае.

Апазыцыі было б ня лішне адпрацаваць канкрэтныя й лякальныя дэталі такое нацыянальнае ідэі ў акругах на будучых выбарах. Сам я пляную выкласьці свой погляд у кнізе, якую цяпер рыхтую.

## Беларускі рух

Нацыянальны рух ня ў лепшым стане, чым ідэя. Калісьці моцны й маналітны БНФ раскалоўся, здрабнеў і перастаў выконваць ролю асноватворнае незалежніцкае арганізацыі. Хтосьці сышоў, хтосьці працягвае змагацца, хтосьці замкнуўся ў сваёй партыі, супольны — у выніку робіцца ясна, што зьяднаць і старэйшае пакаленьне, і новапаўсталую моладзь можа толькі такі ж магутны, як і пры канцы 80-х, наступальны й дзейны рух. Само па сабе абмеркаваньне камбінацыяў ці зьвязак у сучасным броўнаўскім стане нацыянальных сілаў ня мае сэнсу. Асобныя суб'екты могуць выканаць хіба што ролю цэнтраў крышталізацыі, але пераплавіць, паглынуць усе адрознасьці й супярэчнасьці, узьняць масавую хвалю будзе здольны толькі *фронт падзеяў*.

Адсюль вынікае генэральная задача правых — пераможная стратэгія. Поле бітвы — каскад выбараў і кампаніяў 2004—2006 г. Першы крок — кансалідацыя ўсіх дзейных сілаў на базе нацыянальнае ідэі. ("Пяцёрка" для гэтага не падыходзіць, надта яна ідэалягічна разнародная і слабая.) Затым — канцэнтрацыя сілаў і сродкаў на найважнейшых кірунках: а) жывы кантакт з большасьцю выбаршчыкаў; б) выбарчы закон і сыстэма камісіяў; в) вулічныя выступы; г) замежнапалітычны ціск на рэжым. Ударныя корпусы — моладзь, прадпрымальнікі й незалежныя прафсаюзы. Апэратыўная задача на 2004 г.: выбарчай кампаніяй у 110 акругах з дапамогай пратэстных настрояў сабраць большасьць галасоў і нанесьці рэжыму поўную псыхалягічную паразу: "Краіна за нас!" 2005 г. — год штурму галоўных апораў рэжыму: маўклівай змовы намэнклятуры, інфармацыйнае манаполіі, гатовасьці сілавых структураў "выканаць любы загад".

Грубыя спробы ўмяшаньня Расеі напярэдадні вырашальнага 2006-га павінны толькі ўзмацніць незалежніцкія настроі й выклікаць салідарны адпор з боку ўсяе беларускае эліты.

Ключавую ролю ў новым узыме нацыянальнага руху могуць сыграць беларускія хрысьціяне. Доля тых, хто верыць у Бога, паводле апытаньняў 2000—2001 г., дасягнула 50% і працягвае расьці. Велізарны патэнцыял хрысьціянства й непрыманьне дыктатуры вернікамі розных канфэсіяў робіцца ўсё больш важкім палітычным чыньнікам. Пяцітысячныя мітынгі ў Менску за апошнія два гады зьбіралі хіба што каталікі й пратэстанты. Хрысьціянскія грамады могуць надаць слабой і зьняверанай апазыцыі духу, веры, што істотна, маральнасьці, — і адыграць у справе пераменаў тую ж ролю, якую ў Польшчы часоў "Салідарнасьці" адыграў Касьцёл або ў Заходняй Украіне — Унія.

## Беларускі прэзыдэнт

Асоба лідэра нацыянальнага руху, хутчэй за ўсё, узьнікне ў іпастасі *беларускага кандыдата* на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г. Відавочна, што ў шэрагу ўдзельнікаў кампаніяў 2004—2005 г. вылучацца некалькі перспэктыўных і папулярных кандыдатаў — маладых, харызматычных незалежнікаў (лепш непартыйных і з правіцы), якія і будуць прэтэндаваць на ролю правадыра. Наймэтазгодней вызначыць *адзінага* зь іх праз "праймэрыз".

Асабістая альтэрнатыва Лукашэнку — апошняя і вырашальная стаўка нашага супрацьстаяньня як рэжыму, так і Маскве. У сёньняшняй Беларусі пасада прэзыдэнта дае беспрыкладныя магчымасьці для рэфармаваньня й рашучага развароту ўсяе дзяржаўнае машыны. Гэта капітальны шанец. У сытуацыі рэзкіх пратэстных настрояў і "эфэкту ківача" беларускі рух можа прывесьці "ў дамкі" і радыкальнага незалежніка, які размаўляе па-беларуску: галоўнае, каб ён здолеў спадабацца асноўным катэгорыям выбаршчыкаў і ў ключавы момант меў сьмеласьць выступіць пэрсанальна супраць Лукашэнкі.

...Адраджэньне *Фронту* адбудзецца рана ці позна — бо гэта гістарычная неабходнасьць. Хутчэй за ўсё, пад іншай назвай. У горне падзеяў бліжэйшых гадоў. З абноўленай ідэяй і новым пакаленьнем. Пераканаць — усе *фронтаўцы* разам выйдуць на тую пераможную маніфэстацыю аксамітнае рэвалюцыі, якая нарэшце дасьць пачатак новай Беларусі.

**Павал Севярынец, фронтавец**

## Таварыства беларускай мовы адмовілася ад ідэі стварэньня Нацыянальнага ўнівэрсытэту пад крылом дзяржавы.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Нацыянальны не дзяржаўны

Пра гэта гаворыцца ў рэзалюцыі “Пра сытуацыю вакол Нацыянальнага ліцэю імя Якуба Коласа”, прынятай дэлегатамі VIII зьезду ТБМ 12 кастрычніка. На пытаньне аднаго з дэлегатаў “Чаму адмаўляемся ад дзяржаўнага статусу ўнівэрсытэту?” Алег Трусаў адказаў: “Мы разоў дзесяць пісалі Лукашэнку і ягонай Адміністрацыі. Адказ адмоўны. Дык навошта адзінаццаты раз пісаць? Пагатоў, гэтую заяву складалі выкладчыкі і бацькі Беларускага ліцэю — ім зь сярэдзіны лепш відаць, як варта рабіць”. Уладзімер Колас узьняўся зь месца для тлумачэньня: “За прыватнымі ліцэямі будучыня”.

Яшчэ з паўгоду таму А.Трусаў казаў, што Нацыянальны ўнівэрсытэт павінен быць толькі дзяржаўны: мы ўсе падаткаплатнікі, дык, маўляў, мусім патрабаваць, каб нам давалі за нашыя грошы ўсе належныя даброты. Былі нават спадзевы на спрыяньне з боку Адміністрацыі прэзыдэнта ў разьвязаньні гэтае праблемы. Сёньня такіх ілюзіяў ужо няма. “Апошнім часам адбыўся “адкат” улады з ужо абгавораных пазыцыяў, — кажа намесьнік Трусава Сяргей Кручкоў. — Хочацца верыць, што гэта часова. Сёньня да нас прыйшоў з сваімі прапановамі У.Колас: магчыма, мы будзем ствараць пакуль што віртуальны ўнівэрсытэт з дыстанцыйным навучаньнем. Пры гэтым саму навучальную ўстанову можна і не рэгістраваць, абы яна давала нармальную адукацыю”. Апошняе, з увагі на дыстанцыйнасьць ды віртуальнасьць такой ВНУ, — у найбольшай небясьпецы. Дый якую вагу будзе мець дыплём незарэгістраванага ўнівэрсытэту? “Каб дыплёмы мелі належны статус, студэнты нейкі час, верагодна, будуць навучацца ў эўрапейскіх ВНУ”, — адказвае С.Кручкоў.

Не асабліва спадзяецца ТБМ і на беларусізацыю электронных СМІ. Па русіфікаваным БТ і FM-станцыях Таварыства зьбіраецца ўдарыць недзяржаўным нацыянальным тэлеканалам. Праца над якім, нібыта, ужо на апошняй стадыі. Пра падрабязнасьці С.Кручкоў гаварыць адмовіўся: “Баюся, пачнецца паляваньне на ідэю й тых, хто штурхае гэтую ідэю”. Практычна гатовая й камутарная праграма праверкі артаграфіі беларускамоўных тэкстаў, паведаміў сп.Сяргей. Яна будзе існаваць у двух варыянтах — для “тарашкевіцы” і для “наркамаўкі”.

Зьезд крыху нагадваў сход пэнсіянэраў: пераважалі “тыя, каму за пяцьдзясят”. Аднак паэтка Лера Сом раіць асабліва не перайманца з гэтай нагоды — маўляў, на зьезд выбіралі зважаючы на аўтарытэт і рэгаліі. “Тыя, каму сёньня па дваццаць гадоў, яшчэ пабойваюцца ехаць на такое мерапрыемства. Гадоў праз пяць яны “абатруцца”, і тады сытуацыя будзе выглядаць зусім інакш”.

Трусава ў кулюарах хвалілі. За ім у ТБМ зьмяніўся спосаб кіраваньня. Старшыні суполак бяруць на сябе пераважна каардынацыйныя функцыі, даючы шараговым тэбээмаўцам усяляк выяўляць ініцыятыву. “Трусаў ніколі не адмаўляе, калі нават на момант прапановы ня дужа верыць у рэальнасьць прапанаванай справы”, — гаворыць С.Кручкоў. Відаць, гэтыя якасьці паспрыялі таму, што старшыню з усім ягоным “урадам” пераабралі на наступны тэрмін.

**Адам Воршыч**

# БРСМ. Навінкі агітацыі

**Калісьці каля сямідзесяці адсоткаў “лукамольцаў” складалі вясковыя школьнікі, і гэта нікога не турбавала. А праводзячы адзін раз на год конкурс вайскова-патрыятычнай песьні, зрэдзьчасу дасылаючы цыркуляры па навучальных установах, можна было ўвогуле не напружвацца.**

Але няма таго, што раньш было. Сёлета да ідэалёгіі прычапіліся як п’яны да плоту, змусіўшы БРСМ стварыць хаця б імітацыю нейкай дзейнасьці.

І вось кіраўніцтва распачало рэклямную кампанію, збольшага пры дапамозе самага пашыранага сродку мінулага стагодзьдзя — нагляднай агітацыі. Вынікам сталіся цуды дызайнэрскай думкі, пабачыць якія можна дзе заўгодна — ад найбліжэйшай крамы “Гародніна” да студэнцкай аўдыторыі.

Найчасьцей сустракаецца плякат “Выбирай будущее вместе с нами!”. Якраз пад гэтым заклікам зьмешчаныя фатаздымкі двух усьмешлівых маладзёнаў. Гэтыя двое, што заклікаюць моладзь усёй краіны абіраць будучыню разам зь імі, ды яшчэ зь непадпісаных здымкаў, мабыць, асобы выбітныя й павінны быць пазнавальнымі для кожнага пэтэвэшніка. Дык хто ж яны насамрэч? Для дзеячоў навукі й культуры шчэ надта саплівыя. Калі спартсмэны, то чаму без спартовых нагавіцаў і ўзнагародаў? На заднім пляне плякату адлюстраваныя дзьве сьцежкі да помніка Перамогі над Нямеччынай. У такім разе цалкам магчымай робіцца прыналежнасьць фатаздымкаў юным героям-антыфашыстам часоў другой сусьветнай. Толькі вось іх сучасныя строі аніяк на сорак пяты год ня цягнуць. Дый вайна ўжо 58 гадоў як скончылася. Пры чым тут будучыня? У любым выпадку, я б ня раіла падлеткам зьвязваца з гэтымі незнаёмцамі. Стасункі зь няпэўнай кампаніяй да добрага не даводзяць. Тым больш што, выступаючы па радыё, адзін зь лідэраў БРСМ ня толькі эмацыйна распавядаў аб адпачынку моладзі ў Краснадары, але й заклікаў прыяжджаць у будатрад яшчэ. І гэта ўсяго праз тыдзень пасьля тэракту!

Каляндар ад БРСМ, наадварот, абуджае найлепшыя чалавечыя пачуцьці, выклікае замілаваньне й мог бы рэклямаваць нацыянальны цэнтар усынаўленьня ня горай за вядомы ролік “Знайдзі мяне, мама”.

Прычына таму — групавы здымак дзесяці—дванаццацігадовых хлопчыкаў пад подпісам “В будущее — вместе с нами!”. Але й тут не абышлося без блытаніны. Справа ў тым, што бліжэй да правага краю зьмешчаны яшчэ адзін надпіс: “Молодость — прекрасна!”. Далей ідзе пералік самых цудоўных дзён маладосьці: Дзень ведаў, Дзень моладзі, дні народзінаў прэзыдэнта РБ, БРСМ, БПСМ, БРПА, ЛКСМБ, ВЛКСМ.




Але ўсё такі, як бы там ні было, распрацоўка каляндарыка й плякату — проста забаўка дзіцячая ў параўнаньні з улёткаю. Гэты агітацыйны матэрыял здольны запалохаць уражлівага першакурсьніка ажно да дрыжыкаў. Уявіце сабе абстрактны малюнак жаночай галавы, выкананы пераважна ў фіялетава-блакітных тонах. Толькі вось адно вока чамусьці намаляванае жоўтай фарбай. Які вобраз мастак хацеў увасобіць у сваім творы? Наркаманкі або ахвяры гвалту зь незагоеным вокам? Наўскасяк аркушу — тлумачальнае папярэджаньне: “БРСМ — почувствуй эпоху”.

І сапраўды, адчуваньні апаноўваюць настолькі яскравыя й выразныя, што хочацца бегчы адсюль як мага далей, аж да самага далягляду.

**Тацяна Барысік, Магілёў**

## Салют за паўтара мільёна

**11 кастрычніка Шаркаўшчына адзначыла 500-гадовы юбілей.** Гукі сьпеваў і музыкі чуліся з чатырох арэн, якія разьмясьціліся на галоўных вуліцах. Пампэзная рэкляма выступу Сяргея Мінскага выглядала так, быццам да нас едзе “Scorpions”. Брыгада пажарных зрабіла сюрпрыз жыхарам-“юбілярам”, наладзіўшы воднае шоў, ад якога гледачы бараніліся парасонамі. А вось дэсантнікаў-парашутыстаў зь Віцебску не дачакаліся — надвор’е не спрыяла. Ноччу неба над Шаркаўшчынай ня раз скаланулася ад салюту, на які было выдаткавана 1,5 млн рублёў.

Да 500-годзьдзя Шаркаўшчына рыхтавалася зь лета: былі добраўпарадкаваныя дарогі, зроблены капітальны рамонт будынку райвыканкаму, рэканструяваная плошча перад ім. У той час як двухпавярховая будыніна ўнівэрмагу насупраць ужо бадай пяты год стаіць занядбаная. Пабудаваная і новая паліклініка. Гэтае памяшканьне прызначалася для новага шпіталю, але праз невыкананьне працы ў тэрмін вырашана было зрабіць тут толькі паліклініку, пад’езд да якой, дарэчы, надта нязручны. Бальніца ж (адно з аддзяленьняў якой — тэрапія — месьціцца ў будынку былога панскага маёнтку), як і раней, знаходзіцца на ўскраіне гораду. Праз некалькі месяцаў Шаркаўшчына стане дасягальнай для мабільнае сувязі.

**Людміла Асіпенка, Шаркаўшчына**

## Куды ні ткніся, усюды плаці

**Больш за дваццаць прадпрымальнікаў, якія арандуюць памяшканьні і плошчы ў Астравецкім УКБА, атрымалі лісты ад кіраўніцтва гэтай арганізацыі.** У іх утрымліваецца просьба ахвяраваць грошы.

Накіраваць такія лісты кіраўніцтва УКБА прымусіла рашэньне райвыканкаму “Аб зацьвярджэньні раённай праграмы па добраўпарадкаваньні г.п.Астравец і населеных пунктаў раёну”. Кожны прадпрымальнік павінен будзе ў добраахвотна-прымусовым парадку пераказаць грошы на ўпарадкаваньне тэрыторыі ля Дому быту. Сума залежыць ад арандаванай плошчы (за кожны квадратны мэтар арэнды — восем тыс.руб.). Цікава, што такія “пабoры” ўжо ладзіліся падчас рамонту прыбіральні і даху. Ня вельмі вясёлае жыцьцё ў астравецкіх прадпрымальнікаў, бо каб спаць спакойна (як у рэклямным роліку), недастаткова своечасова заплаціць падаткі. Трэба ўкласьці грошы і ў плітку для ходнікаў. Каб не непакоілі ўлады і падаткавікі. Апошнія таксама тэлефанавалі прадпрымальнікам і запрашалі на лекцыю па пытаньнях падаткаабкладаньня-2004. За навуку прадпрымальнікі зноў павінны былі заплаціць па 15 тыс. руб. Куды ні ткніся, усюды заплаці.

## Асуджаныя, але не пасаджаныя

**Трох жыхароў Астравеччыны ў красавіку затрымалі памежнікі пры спробе перапраўць у Літву 12 кітайцаў.** Прысуд астравецкага суду да двух зь іх быў тры з паловай і тры гады абмежаваньня свабоды. Трэці будзе вымушаны паўтара году выплачваць дзяржаве 20% свайго заробку. Нягледзячы на ўступленьне прысуду ў сілу, двое з тройкі пакуль пакараньня не нясуць. Проста “на хіміі” няма свабодных месцаў.

**Мар’ян Вянгроўскі, Астравец**

# Другая Няміга



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Працяг са старонкі 1.**

Пасьля вайны быў тут дзіцячы дом, пасьля — дом для састарэлых, а потым ужо — дыспансэр. Некаторыя пражылі ў ім усё жыцьцё, па шэсьцьдзесят гадоў. Так нам сказалі ў сельсавеце. У Казлоўшчыне існуе месца на праваслаўных могілках, дзе хаваюць нябожчыкаў з дыспансэру. У Казлоўшчыне пабудаваны і дом для пэрсаналу. Хадзілі некаторыя хворыя ў казлоўшчынскую царкву, а іншыя — у свой рандзілавіцкі касьцёл Сэрца Езуса, які зусім побач. І да споведзі прыходзілі, і камунію прымалі. Нават аднаго хворага хрысьцілі. Адзін вясковец прыйшоў раніцай да касьцёлу, а там людзі кажуць: дурдом згарэў. "Гэта яго так у вёсцы называлі, — тлумачыць ён. — Панаехала пажарных, міліцыі, начальства, нікога не пушчалі. А потым прыйшлі машыны і забралі трупы".

Пажарныя з Казлоўшчыны прыехалі хутка — за 5-6 хвілін. Аднак выклікалі іх запозна. Тэлефона ў будынку не было, трэба было бегчы да яго ў мэдпункт мэтраў 150 дакладна. Калі мы на наступны дзень заехалі ў Казлоўшчыну, рознакаляровыя брандспойты сушыліся на плоце. Саміх удзельнікаў тушэньня пажару выклікалі ў Дзятлава — на "разбор палётаў".

А 9-й раніцы ў нядзелю ў касьцёле адбылося набажэнства, прыехаў ксёндз Аляксандар з Слоніму, маліўся зь людзьмі за ахвяраў пажару. "За інвалідаў", — як сказаў адзін дзядзька.

Жанчына ў касьцёле казала, што шкада асабліва "разумнейшых". Быў там Сашка, які сядзеў каля іх у касьцёле. Прыйшоў аднойчы, яго пахрысьцілі, і ён стаў моцным вернікам. Казаў: раней мог вылаяцца часам, а цяпер — не. Апавядаў пра сваё жыцьцё: сам зь Менску, тэлефон маці пакінуў. Яго лепш апранулі, ксёндз дапамог. "Добры быў хлопчык", — гаворыць жанчына. А потым людзі казалі, што чулі, як у час пажару енчылі тыя хворыя, што гарэлі. А яна ім: тыя задыхнуліся ад дыму. Енчылі тыя, хто ўратаваўся.

**Сяргей Максімовіч, Рандзілаўшчына—Гарадня**

# Маленькая вайна пад Баранавічамі

**Скончыліся вучэньні "Чыстае неба" пад Баранавічамі. Адзін з "партызанаў", бізнэсовец А.М., распавёў чытачам "НН" аб службе.**

"Дахаты па мяне прыйшлі вечарам 5 кастрычніка, прынесьлі позву й загадалі зьявіцца ў ваенкамат ранкам. Там пагрузілі ўсіх у аўтобусы й завезьлі за колькі кілямэтраў ад гораду ў дзіцячы лягер "Вясёлка" каля Паўлінава. Тамака ў драўляных бараках ужо былі зробленыя двухпавярховыя ложкі.

Прызвалі на вучэньні 600 чалавек. Апошніх давозілі ў ноч на аўторак. У асноўным усе з Баранавіч і раёну. Здаецца, толькі з Маларыты прывезьлі 80 "партызанаў" яшчэ. Называліся мы тэрытарыяльнымі войскамі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Усім выдалі новае афіцэрскае ўбраньне добрай якасьці — ад трусоў да каскі. Аўтаматы таксама новыя, з складоў, але 1968 году выпуску.

Дысцыпліна была як у войску — ніякіх п'янак, якія звычайна адбываліся на зборах за саветамі. Калі каго прывозілі з хаты выпіўшы, дык саджалі на "гаўптвахту" — у жалезную будку "ўралу". Тамака ў холадзе апрытомневаеш вельмі хутка. Таму навука была вельмі яскравая. Лягер ахоўвалі жаўнеры з Барысаўскай камэндатуры. Увесь час патрулявалі па лесе ў наваколльлі па трох, з дубінкамі. Цывільныя машыны запынялі й не прапускалі.

Расклад быў такі. А 5-й пад'ём, выдача зброі, сьняданак. А 8-й былі на палігоне. Адтуль прывозілі толькі на абед. Вярталіся пасьля 20.00. Пакуль здавалі зброю, чакалі вячэры (сталоўка ўсіх адразу не зьмяшчала), дык, стомленыя, валіліся спаць.

Муштравалі нас на палігоне ў Дзераўной. Увесь тыдзень перад вучэньнямі стралялі толькі баявымі. Стралялі шмат. Адпрацоўвалі розныя мэтады і сытуацыі — нават умовы бою ў горадзе. Шмат кансультантаў прысутнічалі й давалі парады — усе палкоўнікі, не ніжэй. Разам з намі рыхталіся й тры гарматы — узвод артылерыстаў.

Наведвалі нас старшыня Берасьцейскага аблвыканкаму Даўгалёў і старшыня Баранавіцкага гарвыканкаму Дзічкоўскі. Апошні праводзіў баявы агляд. Міністар абароны таксама прыязджаў, яму вельмі спадабалася. Пасьля Мальцава прывезьлі замежных журналістаў…

Толькі па вучэньнях мы даведаліся, што ў іх бралі ўдзел расейцы. Як казалі афіцэры, у самалётах сядзелі расейскія летуны, а танкамі кіравалі жаўнеры з Таманскай дывізіі. Той шматлікай тэхнікі, пра якую пішуць у прэсе, асабіста я ня бачыў. Было чатыры самалёты, чатыры штурмавыя верталёты і адзін дэсантны — таксама расейскія.

Падчас саміх вучэньняў усе стралялі толькі халастымі. Танкавыя мішэні падрывалі, бо танкі таксама гахалі з халастых. У нас усё было расьпісана па хвілінах, камандзір сядзеў з хранамэтрам — за чатыры хвіліны выпускаем два аўтаматныя ражкі, а пасьля нейкага перапынку выстрэльваем за дзьве хвіліны яшчэ ражок.

Вучэньні — гэта быў спэктакль для Лукашэнкі й акрэдытаваных замежнікаў. Аднак узровень саміх збораў быў вельмі высокі і прафэсійны.

Кажуць, што прэзыдэнт пасьля вучэньняў паехаў глядзець бункер кіраваньня, які застаўся яшчэ ад Саюзу. Тым салдатам, якія абслугоўвалі Лукашэнку, ён асабіста падараваў новую форму. А ў нас увечары ў нядзелю ўсё пазабіралі й нас распусьцілі па хатах".

**Руслан Равяка, Баранавічы**

# Што ў Ліцэі

Міністэрства адукацыі зь ліцэістамі змагалася. Пракуратура ж Кастрычніцкага раёну, куды зьвярнуліся бацькі Кацярыны Раковіч, іх ігнаруе. Дзяўчына была зьбітая ахоўнікам і атрымала расьцяжэньне зьвязак на назе 13 жніўня, калі спрабавала прайсьці ў будынак гарадзкога камітэту адукацыі. Пракурор Кірыл Мазоўка валаводзіў з разглядам справы як мог: выклікаў Кацю з бацькамі на допыт толькі ў апошні дзень, пасьля якога сканчаўся тэрмін разгляду, а потым яшчэ месяц пісаў адказ. Праз паўтара месяца, замест належных двух тыдняў, Кацiны бацькі атрымалі ліст, зь якога даведаліся пра невінаватасьць ахоўніка: ён, на думку пракурора, толькі выконваў свае абавязкі. Значыць, і заводзіць крымінальную справу няма патрэбы. Цяпер, як кажа маці Вольга Раковіч, яны апратэстоўваюць рашэньне К.Мазоўкі ў гарадзкой пракуратуры.

Паразуменьня ліцэісты не знаходзяць і з боку гарадзкога камітэту адукацыі ды ўласна Міністэрства. Кампраміснага шляху да разьвязаньня праблемы там ніхто не шукае: міністар Аляксандар Радзькоў зьбег ад ліцэістаў, якія хацелі павіншаваць яго з Днём настаўніка, а ў новаабвешчаны Менскі гарадзкі гуманітарны ліцэй прызначаная новая дырэктарка — Тацяна Замыслова. Раней яна працавала ў аддзеле адукацыі Фрунзэнскага раёну, а да таго, як распавядаюць пэдагогі, — пад кіраўніцтвам цяперашняга намесьніка міністра Казімера Фарыны. Менавіта гэты чыноўнік пастаянна прыязджаў у ліцэй цягам лета — то прывозіў сумнавядомую Тамару Шчарбачэвіч, то "залагоджваў канфлікт". Новай дырэктарцы даручылі наглядаць за рамонтам будынку на Кірава, 21. Між тым за чатыры месяцы рамонту не зрабілі нават ягонага каштарысу, вядзецца толькі падрыхтоўчая праца.

Тым часам вучыцца ліцэісты працягваюць на кватэрах. Калектыў ліцэю падрыхтаваў дакумэнты для рэгістрацыі прыватнай навучальнай установы ў Міністэрстве юстыцыі. Але пакуль што бракуе грошай на ўтварэньне і ўтрыманьне прыватнага ліцэю. Можна меркаваць, што з дапамогай ТБМ, задэклараванай на нядаўнім зьезьдзе, разьвязаць пытаньне дзейнасьці прыватнага ліцэю будзе прасьцей.

**Аркадзь Шанскі**

**"Наша Ніва" запрашае** да супрацы выпускнікоў і студэнтаў унівэрсытэтаў — людзей беларускіх, якія хочуць стаць журналістамі.

## Падпіска

Нагадваем, што падпіскаю газэта абыходзіцца таньней. Падпісны індэкс 63125. Цана падпіскі на месяц — **2043** рублі. На шапік "Белсаюздруку" — усяго **1360** рублёў. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках "Белсаюздруку".

Дык падпісвайся!

● ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА ●

## Супэрмаркеты ў Віцебску

Брытанская кампанія “Willisden Industries Limited” мае збудаваць у Віцебску два гандлёвыя цэнтры: на Новааршанскай шашы ў раёне тэлезаводу — унівэрсам; у раёне пасёлку Білева — гіпэрмаркет. Праекты пакуль абмяркоўваюцца. Брытанская кампанія пляуне за 4—5 гадоў укласьці ў разьвіцьцё розьнічнай гандлёвай сеткі Беларусі 125 млн даляраў. У верасьні кампанія пачала будаўніцтва першага супэрмаркету (плошчай 5,5 тыс. кв.м) у Менску, у раёне аўтавакзалу “Ўсходні”.

## Таксоўкі мусяць пажаўцець

Новы нацыянальны стандарт СТБ 1389-2003 пачынае дзейнічаць у Беларусі з 1 лістапада. Згодна зь ім, таксоўкі павінны быць пафарбаваныя толькі ў жоўты колер ці хоць бы мець жоўты пас. Патрабаваньні Дзяржстандарту, адпаведныя міжнародным нормам, пашыраюцца і на маршрутныя таксоўкі. Так, шыльдачка з апісаньнем маршруту павінна быць пэўнага фармату і не на паперы, а на цьвёрдым матэрыяле.

## Нацыяналізацыя страхаваньня транспарту

Абавязковае страхаваньне транспарту будзе перададзенае ў кампэтэнцыю выключна дзяржаўных страхавых кампаніяў “Белдзяржстрах”, “Белэксімгарант” і “Стравіта”. На іх долю з новага году будзе прыпадаць больш за два мільёны транспартных сродкаў, зарэгістраваных у Беларусі. Пастанову Саўміну аспрэчваюць чатыры сотні прыватных страхавікоў.

## Новы “Опэль-Сыгнум”



На беларускім рынку зьявіцца новы аўтамабіль — “Opel Signum”. Ён будзе прэзэнтаваны 19 кастрычніка ў аўтасалёне “Opel”. У Эўропе машыну прэзэнтавалі ў красавіку. Пры габарытах звычайнага сэдану (даўжыня 4 м 80 см) ён мае вельмі вялікую колавую базу, што дадае камфорту ў часе язды. Упершыню ўстаноўленая ў новым “Opel Signum” сыстэма “Travel Assistant” ператварае месцы на заднім сядзеньні ў офіс ці кінатэатар. Каштуе новы опэль 16.800 эўра.

## Новае ў справе балтыйскага газаправоду

Расейскі канцэрн “Газпром” шукае партнэраў для будаўніцтва газаправоду з Расеі ў Заходнюю Эўропу па дне Балтыйскага мора. У мінулую пятніцу наконт гэтага праекту, кошт якога ацэньваецца ў 7 млрд даляраў, вяліся перамовы з прадстаўнікамі фірмы “E.ON”. “Газпром” паведаміў таксама, што зацікаўленасьць у будаўніцтве новага газаправоду выказваюць яшчэ “Royal Dutch/Shell Group”, “Total SA”, “Wintershall” і “Fortum Oil”. Разьліковая магутнасьць газаправоду — 30 млрд кубоў газу ў год.

**СП; БелаПАН**

# Бюджэт-2004: альтэрнатыўны праект

**Альтэрнатыўны праект бюджэту на 2004 год прапанавалі экспэрты дасьледчых цэнтраў “Мізэса” (Яраслаў Раманчук) і “Стратэгія” (Леанід Заіка) разам з дэпутатамі групы “Рэспубліка” (Уладзімер Парфяновіч). Праект закону накіраваны ў Савет Міністраў і прэзыдэнту краіны.**

Прапанаваны праект бюджэту прадугледжвае шэраг рэформаў, перш за ўсё ў падатковай сфэры. Прапануецца адмяніць падатак на дабаўленую вартасьць і замест яго ўвесьці падатак з розьнічнага абароту падаткаў і паслуг. На думку распрацоўшчыкаў праекту, уваходжаньне суседніх краін у Эўразьвяз і далучэньне да эўрапейскай сыстэмы падаткаў можа даць Беларусі шанец стварыць надзвычай прывабны інвэстыцыйны клімат. Прапануецца зьніжэньне падаткаў з прадпрыемстваў з мэтай правядзеньня рэструктурызацыі і мадэрнізацыі. За прыклад узяты падатковыя сыстэмы іншых краін, якія прайшлі сацыяльна-эканамічную трансфармацыю (Японія, Карэя). Іх вопыт паказвае, што падатковая нагрузка не павінна перавышаць 11—25% для стварэньня ўмоў для эканамічнага цуду. Скасаваньне мноства падатковых ільгот, на думку распрацоўшчыкаў, зробіць бюджэт больш празрыстым, зьменшыць карупцыю. Падатковая база павінна быць уніфікаваная для ўсіх катэгорый падаткаплацельшчыкаў. Бюджэт скіраваны на зьніжэньне інфляцыі да 10% у год. Прапануецца пачаць рэструктурызацыю прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

У бюджэце прадугледжваецца павелічэньне пэнсій, заробкаў супрацоўнікаў сфэры адукацыі і аховы здароўя. Павышаюцца бюджэтныя датацыі для шматдзетных сем’яў, фінансаваньне дзіцячых садкоў.

Павялічацца выдаткі на судовую ўладу з мэтай правядзеньня яе рэфармаваньня і на нацыянальны сход. Фінансаваньне органаў праваахоўнага парадку і войска застаецца на ранейшым узроўні, каб яны маглі правесьці ўнутраную рэструктурызацыю. Будуць скарочаны выдаткі на бюракратычныя структуры ўнутры гэтых органаў.

Скароцяцца бюджэтныя праграмы бязадраснай падтрымкі сельскай гаспадаркі, прамысловасьці і іншых галінаў, якія патрабуюць вялікага бюракратычнага абслугоўваньня. Замест гэтага будзе праводзіцца палітыка спрыяньня і адраснай дапамогі асобнаму грамадзяніну. Прапануем увазе чытачоў “НН” асноўныя палажэньні праекту.

**Артыкул 1.** Зацьвердзіць рэспубліканскі бюджэт на 2004 год па расходах у суме 9755 млрд рублёў, зыходзячы з прагназаванага аб’ёму даходаў у суме 9755 млрд рублёў. Рэспубліканскі бюджэт зьяўляецца бездэфіцытным.

Сродкі, якія паступаюць у бюджэт звыш указаных у гэтым Законе, выкарыстоўваць на фармаваньне Стабілізацыйнага фонду. Сродкі Стабілізацыйнага фонду выкарыстоўваюцца для нэўтралізацыі шокаў ліквідасьці дзяржаўнай фінансавай сыстэмы.

**Артыкул 2.** Дзяржаўны фонд спрыяньня занятасьці, рэспубліканскі дарожны фонд, Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва ў 2004 годзе зьяўляюцца дзяржаўнымі мэтавымі бюджэтнымі фондамі.

Ліквідаваць Рэспубліканскі фонд падтрымкі сельскагаспадарчай прадукцыі і харчаваньня, рэспубліканскі фонд “Энэргазьберажэньне”, рэспубліканскі фонд аховы прыроды. Расходы па адпаведных артыкулах ажыцьцяўляць з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

**Артыкул 7.** Зацьвердзіць на 2004 год нарматывы адлічэньняў у бюджэты Берасьцейскай, Віцебскай, Гарадзенскай, Гомельскай, Магілёўскай, Менскай абласьцей і г.Менску, зыходзячы з наступных фактараў:
- колькасьць пэнсіянэраў;
- колькасьць інвалідаў першай і другой групы;
- колькасьць вэтэранаў вайны, асоб, якія пацярпелі ў час ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС;
- колькасьць шматдзетных маці;
- колькасьць грамадзян, якія маюць права на атрыманьне кампэнсацыі затрат на жыльлёва-камунальныя паслугі і на паслугі грамадзкага транспарту;
- колькасьць дашкольных установаў;
- колькасьць школ і прафтэхвучылішчаў;
- колькасьць ВНУ;
- колькасьць паліклінік і бальніц;
- колькасьць дамоў-інтэрнатаў для састарэлых і інвалідаў;
- колькасьць мясцовых выканаўчых камітэтаў.

Кампэнсацыі грамадзянам выдаюцца зыходзячы з узроўню грашовых і неграшовых даходаў. Парадак атрыманьня кампэнсацыі, пералік крытэраў для яе выдачы вызначаюцца Саветам Міністраў.

**Артыкул 8.** У 2004 годзе:

1. Абласныя, Менскі гарадзкі Саветы дэпутатаў, Саветы дэпутатаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню ўводзяць на тэрыторыі адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак наступныя мясцовыя падаткі і зборы: збор за паркоўку ў спэцыяльна абсталяваных месцах, збор з уладальнікаў сабак, курортны збор, збор на рэкляму ў месцах грамадзкага карыстаньня, рыбалоўны і паляўнічы зборы.
2. Абласныя, Менскі гарадзкі Саветы дэпутатаў, Саветы дэпутатаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню самастойна вызначаюць канкрэтныя памеры ставак, плацельшчыкаў, парадак налічэньня і тэрміны выплаты мясцовых збораў у адпаведнасьці з гэтым Законам ці іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусі.

**Артыкул 10.** Зацьвердзіць расходы рэспубліканскага бюджэту на 2004 год у суме 9755 млрд рублёў згодна з Дадаткам 2.

Устанавіць, што ў 2004 годзе прыярытэтнымі напрамкамі бюджэтна-фінансавай палітыкі дзяржавы зьяўляюцца:
- нэўтралізацыя нэгатыўных вынікаў сыстэмных рэформаў для найбольш сацыяльна неабароненых грамадзян, у тым ліку грамадзян, зьвязаных з ліквідацыяй вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;
- захаваньне ўстойлівага фінансаваньня аховы здароўя, адукацыі;
- павелічэньне фінансаваньня судовай сыстэмы і захадаў, накіраваных на правядзеньне сыстэмных сацыяльна-арыентаваных рыначных рэформаў.

**Артыкул 13.** Устанавіць на 2004 год:
- сярэдні памер пэнсіі — 55 даляраў ЗША ў эквіваленце ў беларускіх рублях паводле курсу Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі;
- сярэднюю зарплату работніка дзяржаўнай мэдыцынскай установы — 150 даляраў ЗША ў эквіваленце ў беларускіх рублях паводле курсу Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі;
- сярэднюю зарплату настаўнікаў пачатковай і сярэдняй школы — 150 даляраў ЗША ў эквіваленце ў беларускіх рублях паводле курсу Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі;
- сярэднюю зарплату работніка органаў дзяржаўнага кіраваньня — 180 даляраў ЗША ў эквіваленце ў беларускіх рублях паводле курсу Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі;
- сярэднюю даплату грамадзяніну па жыльлёва-камунальных умовах (у выпадку нізкага даходу) — ня больш за 20 даляраў ЗША ў эквіваленце ў беларускіх рублях паводле курсу Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі;
- сярэднюю даплату грамадзяніну, які ўдзельнічаў у ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, — ня больш за 20 даляраў ЗША ў эквіваленце ў беларускіх рублях паводле курсу Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі;
- сярэднюю даплату грамадзяніну з прычыны інваліднасьці (інваліды першай і другой групы) — ня больш за 30 даляраў ЗША ў эквіваленце ў беларускіх рублях паводле курсу Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі;
- сярэднюю даплату на адно дзіця ў шматдзетнай сям’і — ня больш за 30 даляраў ЗША ў эквіваленце ў беларускіх рублях паводле курсу Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі.

Памер даплат адной хатняй гаспадарцы па ўсіх артыкулах ня можа перавышаць 60 даляраў ЗША ў эквіваленце ў беларускіх рублях паводле курсу Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі.

**Артыкул 14.** У 2004 годзе рэспубліканскі бюджэт перадае ў бюджэты мясцовага ўзроўню сродкі на ўтрыманьне аб’ектаў сацыяльна-культурнай сфэры згодна з каштарысам расходаў на кожны канкрэтны аб’ект.

**Артыкул 17.** Устанавіць, што ў 2004 годзе:

1. Памер прыросту ўнутранага дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусі ня можа перавышаць трох працэнтаў ад валавога ўнутранага прадукту.
2. Нацыянальнаму банку спыніць выдачу крэдытаў ураду на ўмовах, адрозных ад умоў, на якіх ён працуе з камэрцыйнымі банкамі. Плата за абслугоўваньне крэдытаў, выдадзеных у 2003 годзе Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусі Ўраду Рэспублікі Беларусі, спаганяецца на ўзроўні стаўкі рэфінансаваньня, якая вызначаецца Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусі.
3. Аднесьці на ўнутраны дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусі сумы выдадзеных у 2003 годзе Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусі крэдытаў на фінансаваньне дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту з абслугоўваньнем гэтых крэдытаў Міністэрствам фінансаў пад стаўку рэфінансаваньня.

**Артыкул 22.** Нарматыўныя прававыя акты, якія цягнуць за сабой дадатковыя расходы звыш сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце ў 2004 годзе, прымаюцца палатай прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі, зацьвярджаюцца саветам рэспублікі нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі і прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі. Толькі пасьля праходжаньня гэтай працэдуры Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусі атрымлівае права ўносіць карэктывы ў даходную і расходную часткі бюджэту.

**Артыкул 23.** Устанавіць, што ў 2004 годзе рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіраваньня і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, падначаленыя Ўраду Рэспублікі Беларусі, ажыцьцяўляюць расходы ў межах прадугледжаных плянавых асыгнаваньняў і згодна з каштарысам, які зацьвярджаецца для кожнага падразьдзяленьня. Нарматыўныя прававыя акты аб выдзяленьні сродкаў ці аб устанаўленьні парадку фінансаваньня ў 2004 годзе, прынятыя (выдадзеныя) да 2004 году, лічацца такімі, што страцілі сілу. Пералік праграм і праектаў, якія фінансуюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, павінен быць уключаны ў склад затрат адпаведнага структурнага падразьдзяленьня выканаўчай улады.

Савет Міністраў ці па яго даручэньні Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусі маюць права ўносіць зьмены ў даходы рэспубліканскага бюджэту ў межах прадугледжаных у Дадатку 1 гадавых паступленьняў толькі ў выпадку іх ухваленьня палатай прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі.

Савет Міністраў, Адміністрацыя прэзыдэнта, аблвыканкамы і гарвыканкамы, а таксама іншыя органы выканаўчай улады ня могуць даваць дзяржаўную падтрымку падаткаплатнікам індывідуальна ў выглядзе зьмяненьня ўстаноўленага заканадаўствам тэрміну выплаты падаткаў і пені.

**Артыкул 24.** Юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам ня можа аказвацца індывідуальная дзяржаўная падтрымка з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў у выглядзе субсыдый і датацый.

**Артыкул 25.** Грамадзкія аб’яднаньні ня могуць атрымліваць дзяржаўную падтрымку з рэспубліканскага бюджэту. Грамадзкія аб’яднаньні могуць выступаць падрадчыкамі органаў дзяржаўнага кіраваньня для выкананьня работ і аказаньня паслуг.

**Артыкул 26.** Пры парушэньні кіраўніком органу выканаўчай улады любога ўзроўню парамэтраў бюджэту, парадку выкананьня расходнай часткі кіраўнік больш высокага выканаўчага органу ўлады, а таксама Савет Міністраў, палата прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі, прэзыдэнт Рэспублікі Беларусі маюць права ставіць пытаньне аб яго адхіленьні ад пасады.

**Артыкул 28.** (…)

Лічыць нарматыўныя акты, згодна зь якімі прадпрыемствы і арганізацыі ўтваралі інавацыйныя фонды, фонд будаўнічай навукі, а таксама іншыя небюджэтныя фонды, што ствараліся органамі дзяржаўнага кіраваньня, такімі, што страцілі моц з моманту ўступленьня ў сілу гэтага Закону.

**Артыкул 29.** Савет Міністраў, выканаўчыя камітэты, мясцовыя Саветы дэпутатаў і іншыя органы дзяржаўнага кіраваньня ня маюць права даваць ільготы па падаходным падатку з грамадзян. Савет Міністраў прымае мэтадычныя ўказаньні, якія вызначаюць паняцьце “даходу” фізычнай асобы і парадак выплаты падатку, на працягу месяца пасьля ўступленьня ў сілу гэтага Закону.

**Артыкул 31.** Устанавіць, што ў 2004 годзе прадпрыемствы самастойна вызначаюць парадак фармаваньня адпускной цаны на тавары, работы і паслугі, амартызацыйную палітыку.

**Артыкул 33.** Савету Міністраў прыняць мэтадычныя ўказаньні, якія вызначалі б парадак налічэньня падатку на нерухомасьць і зямлю, а таксама парадак яго выплаты, на працягу месяца пасьля ўступленьня ў сілу гэтага Закону.

**Артыкул 34.** Гэты Закон уступае ў сілу з 1 сакавіка 2004 году.

**Артыкул 35.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусі прывесьці заканадаўчую базу краіны ў адпаведнасьць з гэтым Законам да 1 сакавіка 2004 году.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Яраслаў Раманчук — гнуткі аўтар наватарскага бюджэту**

**Працяг са старонкі 2.**

# Удачы і пралікі альтэрнатыўнага бюджэту

Пасьпяховасьць рэформаў закладаецца аўтарамі як бы паводле азначэньня.

Узгадаем, што паводле афіцыйнага праекту выдаткі бюджэту Беларусі на 2004 г. вызначаны ў памеры 13,4 трлн руб. (на 27,6% больш, чым паводле альтэрнатыўнага). Прычым уладамі плянуецца дэфіцыт бюджэту ў памеры 1,5% ВУП (0,63 трлн руб.) пры максымальнай інфляцыі 18%. На гэтым тле новы бюджэт выглядае больш прывабна. Тым больш што ён, як і афіцыйны, абяцае бюджэтнікам рост заробкаў да 150 даляраў.

## Падатковыя адрозьненьні

Перад тым як рабіць нейкія ацэнкі, прывядзём асноўныя падатковыя зьмены, якія прапануе новы бюджэт. Замест 36 падаткаў і збораў, якія існуюць цяпер, новы праект прапануе 6 асноўных падаткаў і 5 мясцовых збораў. Ядром новай падатковай сыстэмы зьяўляецца падатак з розьнічнага таваразвароту і продажу паслугаў па стаўцы 20%. Гэты падатак заменіць падатак на дададзеную вартасьць (ПДВ), падатак на прыбытак, абаротныя падаткі, якія разам цягам апошніх гадоў фармуюць да 50% даходаў кансалідаванага бюджэту краіны. Прапанаваныя адзіная стаўка падаходнага падатку (10% замест прагрэсіўнай 9—30% — паводле аналёгіі з расейскай 13%-й стаўкай), падатак на ўласнасьць па стаўцы 1%. Застануцца нязьменнымі стаўкі акцызаў на алькагольныя і тытунёвыя вырабы, паліва. Адлічэньні на сацыяльнае забесьпячэньне, якія цяпер складаюць 35% ад фонду аплаты працы, прапануецца замяніць рэгрэсіўным сацыяльным падаткам па стаўках 25, 15 і 10% у залежнасьці ад памеру грашовага даходу без уліку даходаў ад каштоўных папераў. Градацыя заробкаў, згодна зь якой будуць выкарыстоўвацца стаўкі, аўтарамі не паказаная. Дарэчы, у Расеі аналягічны падатак мае стаўкі 35,6**Андрэй Любчанка** (даход да 100 тыс. расейскіх рублёў), 20, 10 і 2с (з даходу звыш 600 тыс. расейскіх руб. плюс 105,6 тыс. расейскіх руб.). І нарэшце, прадугледжана ўвядзеньне адзінай мытнай стаўкі ў памеры 10%.

Ў суме гэтыя падаткі будуць фармаваць рэспубліканскі бюджэт, дзе мае канцэнтравацца 82% бюджэту краіны. Акрамя падатковых даходаў, бюджэт будуць фармаваць сродкі ад прыватызацыі, продажу акцыяў, разьмяшчэньня дзяржаўных каштоўных папер. “Звышплянавыя” паступленьні будуць скіроўвацца ў стабілізацыйны фонд.

## Слабыя месцы бюджэту

Як заявілі аўтары бюджэту на яго прэзэнтацыі, спрашчэньне/зьмяншэньне падаткаабкладаньня прывядзе да “хуткага паніжэньня адпускных цэнаў прадпрыемстваў на 40—50%”. Амаль удвая. Ці рэальна гэта ў наступным годзе?

Для адказу на гэта пытаньне засяродзім увагу на структуры выручкі ад рэалізацыі прадукцыі ў гаспадарцы Беларусі ў першым паўгодзьдзі 2003 г.

### Структура выручкі ад рэалізацыі прадукцыі гаспадаркі

| № | Складнікі выручкі | 1-е паўг. 2003 г., млрд руб. | Удзельная вага ў выручцы ў 1-м п.г. 2003, % | Рост у 2004 г., разоў (ацэнка) | Прагноз дынамікі структуры выручкі ў 2004, % | Удзельная вага ў выручцы ў 2004, % |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1 | сыравіна і матэрыялы | 7 125,6 | 24,0 | 0,9 | 21,6 | 26,5 |
| 2 | камплектоўныя вырабы | 879,2 | 3,0 | 0,9 | 2,7 | 3,3 |
| 3 | паліва і энэргія | 2 340,0 | 7,9 | 1,4 | 11,3 | 13,8 |
| 4 | выдаткі на аплату працы | 2 721,5 | 9,2 | 1,25 | 11,5 | 14,1 |
| 5 | адлічэньні на сац. патрэбы | 1 028,5 | 3,5 | 1 | 3,5 | 4,3 |
| 6 | амартызацыя | 1 379,8 | 4,6 | 1 | 4,6 | 5,7 |
| 7 | іншыя выдаткі | 1 809,7 | 6,1 | 1 | 6,1 | 7,5 |
| 8 | выдаткі на вытворчасьць прадукцыі (сума 1—7) | 18 503,5 | 62,3 | - | 61,2 | 75,2 |
| 9 | Прыбытак | 1 636,2 | 5,5 | 2,5 | 13,8 | 16,9 |
| 10 | ПДВ, абаротныя падаткі і інш. | 9 560,3 | 32,2 | 0,2 | 6,4 | 7,9 |
| 11 | выручка (сума 8—10) | 29 700,0 | 100 | - | 81 | 100 |

Ліквідацыя ПДВ (20%) і абаротных падаткаў (4,5%) дазволіць зьнізіць цану прадукцыі на 25—27% (можна меркаваць, што велічыня гэтай кампанэнты выручкі зьменшыцца ў 5 разоў, або складзе 20% ад цяперашняй (гл. слупок 5 табліцы). Аднак павышэньне заробку зь цяперашніх 120 да 150 даляраў (у 1,25 разу) тым самым закладае павелічэньне выдаткаў на вытворчасьць (удзельная вага заробку з адлічэньнямі ў выручцы за рэалізаваную прадукцыю па выніках першага паўгодзьдзя складае 12,6%). Тое самае можна казаць і пра такі артыкул выдаткаў, як “паліва і энэргія”, што складае 7,9% у выручцы ад рэалізацыі і ўзрасьце ў зьвязку з ростам цэнаў на прыродны газ сама меней у 1,4 разу (з 35 да 50 даляраў/тыс. $м^3$). Рост закране ня толькі артыкулы выдаткаў. Ва ўмовах, калі “прадпрыемствы самастойна вызначаюць парадак фармаваньня адпускной цаны на тавары”, і пры рэнтабэльнасьці ў эканоміцы 8,2% прадпрыемствы павялічаць прыбытак. Напрыклад, да ўзроўню, які забясьпечвае хаця б простае ўзнаўленьне, — 20%. Такім чынам, гэты складнік цаны, якая ў выручцы складае 5,5%, узрасьце ў 2,5 разу. Калі меркаваць, што астатнія артыкулы выдаткаў (на сыравіну і матэрыялы, амартызацыю) застануцца нязьменнымі, мы атрымаем зьмяншэньне адпускной цаны ў сярэднім у эканоміцы на 16%. Улічым, што частка прадукцыі па зьніжаных цэнах будзе спажывацца галінамі эканомікі ў выглядзе сыравіны, матэрыялаў і камплектоўных. Гэта дае нам права атрымаць зьніжэньне выдаткаў на вытворчасьць па гэтых артыкулах прыблізна на 10% (бо значная частка прамежкавага спажываньня фармуецца за кошт імпарту). У выніку адпускныя цэны агулам зьнізяцца на 19%. То бок патэнцыял зьніжэньня цэнаў распрацоўшчыкамі новага бюджэту завышаны сама меней у 2 разы.

Ёсьць сумневы таксама наконт адэкватнасьці ацэнкі аб’ёму розьнічнага таваразвароту і продажу паслуг, падатак зь якіх, паводле разьлікаў аўтараў бюджэту, мусіць даць 44% прыбыткаў бюджэту, ці 4300 млрд руб. Аўтары плянуюць рост таваразвароту на падставе існай у 2000—2003 г. тэндэнцыі ягонага павелічэньня на 7—12%. Аднак рос ён ня толькі дзякуючы павелічэньню пакупніцкай здольнасьці насельніцтва (пра што сьведчыць зьмяншэньне спажываньня шэрагу харчовых прадуктаў у натуральных адзінках), але і праз рост адноснага ўзроўню цэнаў. Нагадаем, летась улады перасталі рэгуляваць цэны на хлеб, бо яго “зрэгуляваная” цана была на 42% вышэйшай, чым у суседняй Бранскай вобласьці. Шмат у чым гэта было вынікам высокага падатковага цяжару. Як паказалі разьлікі, пры прапанаванай падатковай сыстэме ўзровень адпускных цэнаў прадпрыемстваў і прапанаваньня паслуг у 2004 г. зьнізіцца на 19%. А за кошт айчыннай прадукцыі фармуецца 70% розьнічнага таваразвароту. У гэтых умовах заплянаваны аўтарамі рост таваразвароту на 30% дасьць ягоны сукупны аб’ём 15,2 трлн руб., ці на 11% менш за пакладзеную ў разьлікі прыбыткаў бюджэту велічыню. У выніку прапанаваны бюджэт не далічыцца 360 млрд руб., ці амаль 4% сродкаў. А гэта ўжо ня жарты, бо эквівалентна нявыплаце 2,62 млн пэнсіянэрам месячнай пэнсіі.

Каб розьнічны таваразварот дасягнуў патрэбных 17 трлн руб. (мяркуючы, што цэны імпарту застануцца нязьменнымі), фізычны аб’ём спажываньня павінен вырасьці ў 1,45 разу, ці на 45%. Калі нават дапусьціць, што насельніцтва выкажа попыт такога памеру, дык айчынныя прадпрыемствы за год наўрад ці здолеюць амаль напалову павялічыць вытворчасьць (пры ўсім беларускім досьведзе выкарыстаньня кейнсіянскіх схемаў стымуляваньня попыту і прапанаваньня). Хіба толькі загрузяць іржавыя магутнасьці, што прастойваюць. Але каму патрэбны такія вырабы?

Лібэральныя эканамісты прапануюць простае і рацыянальнае рашэньне — цалкам адкрыць унутраны рынак для якаснай імпартнай прадукцыі. Ва ўмовах рэформавай нестабільнасьці і рэструктураваньня прадпрыемстваў танны імпарт дапаможа падтрымаць узровень жыцьця насельніцтва (прыклад з хлебам). Аднак аўтары бюджэту прапануюць увесьці адзіную стаўку на імпартныя тавары і паслугі —10%. Гэта зробіць імпартныя тавары яшчэ даражэйшымі, паколькі цяпер сярэдняя стаўка мытнага тарыфу складае 8,5%. У выніку пацерпяць найперш канцавыя спажыўцы прадукцыі нашай імпартазалежнай эканомікі. На фоне агульнай лібэральнай скіраванасьці бюджэту прапанаваны памер стаўкі зьдзіўляе (яе сярэдні ўзровень у ЭЗ — 4%). У той жа час аўтарамі бюджэту не закранута такая істотная праблема замежнага гандлю Беларусі, як нетарыфныя абмежаваньні. У выніку галіновага лабіраваньня доля імпартных тавараў, што падпадаюць пад квоты і ліцэнзіі, у агульным кошце імпарту складае 33%. Ня так даўно да мукі, алею і інш. дадаліся нетарыфныя абмежаваньні на маргарын, мыла і алькагольныя вырабы. Для параўнаньня: у Расеі доля кошту імпарту, да якога выкарыстоўваюцца квоты і ліцэнзіі, складае менш за 10%, у краінах-чальцах СГА ў сярэднім — 3%.

Безумоўна, каб не адбылося падзеньня ўзроўню жыцьця насельніцтва, ліквідацыя/зьніжэньне мытных бар’ераў змусіць прадпрыемствы зьніжаць выдаткі, рабіць рэструктурызацыю. Ва ўмовах лібэральнай эканамічнай палітыкі прадпрыемствы будуць зьніжаць выдаткі найперш у артыкуле працоўных выдаткаў. Значна ўзрасьце беспрацоўе. У час актывізацыі рэформаў у эканоміцы ў цэлым узровень беспрацоўя рэальна можа ўзрасьці зь цяперашніх 3,2% да 20%, ці з 140 да 880 тыс. чалавек. Узьнікне неабходнасьць падтрымкі беспрацоўных. Прапанаваная аўтарамі сума выдаткаў па артыкуле “Перападрыхтоўка кадраў, дапамога беспрацоўным” складае 288 млрд руб. (120 млн даляраў) і ня мае тлумачэньняў разьліку. Ці адпавядае гэта сума неабходнай? Вызначым памер дапамогі на ўзроўні бюджэту пражыцьцёвага мінімуму (БПМ), які цяпер складае 108 тыс. руб. Зыходзячы з разгледжаных раней прапановаў зьніжэньня цэн возьмем гэтую велічыню базавай для разьліку дапамогі на 2004 г. Згодна з прынятым аўтарамі сярэднім курсам даляра на 2004 г. (2400 руб./даляр) сярэдні кошт дапамогі беспрацоўным налета павінен скласьці 45 даляраў. Установім, што дапамога будзе давацца кожнаму ня больш за 6 месяцаў на год (пры ліквідацыі адміністрацыйных і падатковых бар’ераў значная частка беспрацоўных стане самазанятай у адкрытым малым бізнэсе). Тады на падтрымку 880 тыс. беспрацоўных спатрэбіцца каля 240 млн даляраў, ці ў два разы болей, чым заплянавана ў гэтым бюджэце на дапамогу і перападрыхтоўку кадраў.

Прапанаваны альтэрнатыўны сацыяльна арыентаваны бюджэт мае патрэбу ў некаторым карэктаваньні, як у даходнай, так і ў расходнай частках. Будзе ці ня будзе бюджэт запатрабаваны ўрадам, але прынамсі аднае з сваіх мэтаў група распрацоўшчыкаў можа дасягнуць — бюджэт атрымае грамадзкі розгалас. А гэта важна, асабліва напярэдадні парлямэнцкіх выбараў.

**Уладзімер Валетка**

## З УСЁЙ КРАІНЫ

### Смургонскія плугі

**На Смургонскім агрэгатным заводзе ў наступным годзе плянуюць пачаць зборку плугоў на восем карпусоў.** Экспэрымэнтальныя вырабы цяпер праходзяць выпрабаваньні ў спэцыялізаваным цэнтры. Раней такія плугі ў нашу краіну пастаўляліся з Нарвэгіі.

**Мар’ян Вянгроўскі, Астравец**

### Маленькія цягнікі

**На двух чыгуначных маршрутах Гарадзенскай вобласьці курсуюць міні-дызэль-цягнікі, зробленыя з двух галаўных вагонаў звычайных дызэль-саставаў**. Распачалі рэгулярныя рэйсы гэтага незвычайнага транспарту працаўнікі Лідзкага пасажырскага ўчастку Баранавіцкага аддзяленьня Беларускай чыгункі, а вагоны для яго зрабілі ў Лідзкім лякаматыўным дэпо.

Тыя дызэлі, якія выпрацавалі свой тэрмін (максымальны — 25 гадоў), ня сьпісваюцца, а абнаўляюцца і эксплюатуюцца далей. Пры такім спосабе рамонту на дызэль з аднаго боку ўсталёўваецца сэкцыя цеплавоза, а з другога — звычайны маторны вагон з кабінай кіраваньня, безь сілавой устаноўкі. Праз гэта “вызваляецца” 38 пасажырскіх месцаў. Агулам у міні-дызэлі атрымліваецца 174 месцы (у звычайным дызэлі іх 648).

Цягнік з двух вагонаў езьдзіць між Лідай і Беняконямі, а таксама і між Ваўкавыскам ды Берастаўвіцай. Пусьцілі іх з улікам невялікае колькасьці пасажыраў. Спэцыялісты кажуць, што на сёньня гэта самы эканамічны від чыгуначнага транспарту.

**СМ; “Биржа информации”**

# Гарачыя выбары ў Азэрбайджане

**Перадвыбарная кампанія ў Азэрбайджане сваім брудам пераўзышла іншыя постсавецкія выбары.** На наступны дзень па 50-тысячным мітынгу апазыцыі ў цэнтры Баку, удзельнікі якога падтрымалі кандыдата ад партыі “Мусават” Ісу Гамбара, два чалавекі ў сталіцы спрабавалі ўчыніць самаспаленьне перад будынкам Цэнтравыбаркаму. Гэта былі сябры партыі “Муасір Мусават”. Такім чынам яны спрабавалі дабіцца адмены рэгістрацыі таго ж Ісы Гамбара ў якасьці кандыдата. Апазыцыя лічыць партыю “Муасір Мусават” створанай на грошы спэцслужбаў дзеля дэзарыентацыі выбарцаў. Іса Гамбар — самы папулярны лідэр раздробленай азэрбайджанскай апазыцыі.



AP

Спроба “самагубства” не ўдалася, абодва прадстаўнікі “Муасір Мусават” з апёкамі рознае цяжкасьці трапілі ў шпіталь. Іса Гамбар застаецца наймацнейшым канкурэнтам Ільхама Аліева, але няшмат шанцаў, што выбары, якія адбываюцца ў такой атмасфэры, будуць справядлівымі. Гейдар Аліеў на момант выбараў заставаўся ў клініцы ў Клівлендзе.

На выбарах працуе вялікая група незалежных беларускіх назіральнікаў на чале з кіраўніком Праваабарончага цэнтру “Вясна” Алесем Бяляцкім. На момант здачы нумару пра сваю перамогу заявілі і Аліеў, і Гамбар.

## Узнагароды Гаўлу

**Былы прэзыдэнт Чэхіі Вацлаў Гавал узнагароджаны найвышэйшымі дзяржаўнымі ордэнамі краіны.** У аўторак яму ўручылі ордэн Белага Льва і ордэн Тамаша Масарыка (стваральніка Чэхаславаччыны). Гавал — першы паваенны прэзыдэнт, гэтак уганараваны. На ўрачыстасьць не зьявіліся толькі камуністы і цяперашні прэзыдэнт Чэхіі Вацлаў Клаўс — асабістыя ворагі Гаўла.

## Хлусьлівая кніга пра Катынь у Расеі

**Дасьледчык Юры Мухін у выдадзенай у Маскве кнізе “Антырасейская подласьць”** на амаль 800 старонках спрабуе давесьці, што польскіх афіцэраў у Катыні, Харкаве і Медным расстралялі не НКВД, а гітлераўцы, — як на працягу многіх год і сьцьвярджала савецкая прапаганда. Ён заяўляе, што падпісаныя Сталіным дакумэнты, у якіх загадвалася расстраляць польскіх афіцэраў, былі сфабрыкаваныя ў лябараторыях КГБ незадоўга перад распадам СССР. “У 80-х гэтую правакацыю спрабавалі рэанімаваць нізкапаклоньнікі з ЦК КПСС, генпракуратуры, Акадэміі навук, каб пазбавіць Расею саюзьнікаў і падштурхнуць краіны Ўсходняй Эўропы ў NATO”, — піша Мухін.

Кніга выйшла накладам у 15 тыс. асобнікаў у выдавецтве “Крымскі мост 9D” у сэрыі “Рэканструкцыя эпохі”, якая расказвае пра найбуйнейшыя змовы ў гісторыі чалавецтва.

## “Грамадзянская плятформа” за беларусаў

**Польская партыя “Грамадзянская плятформа” прапанавала ў аднабаковым парадку ўвесьці бясплатныя візы для грамадзянаў Беларусі ў якасьці жэсту добрай волі.** Зварот падтрымалі й прыватныя прадпрымальнікі Беласточчыны.

## Нуэстра Амэрыка

**Каля 16% (47 млн) грамадзянаў ЗША, старэйшых за пяць гадоў, размаўляюць дома не па-ангельску.** У 1990 г. гэтая лічба была на 15 млн меншай. Самай папулярнай “другой мовай” зьяўляецца гішпанская (на ёй гавораць 28,1 млн чалавек).

## Каб не ўпусьціць выгады

**Просьба аб дазволе лавіць рыбу ў Мёртвым моры паступіла нядаўна ва ўрад Ізраілю.** На жаль, у адпаведным міністэрстве не было чыноўніка, які б адказваў за рыбалоўства ў гэтым вадаёме. Воды Мёртвага мора ў восем разоў салянейшыя за акіянскія, там жывуць толькі некалькі відаў бактэрыяў. Гэтыя рыбакі-энтузіясты належаць да групы артадаксальных пратэстантаў зь Вялікай Брытаніі, якія ў Бібліі вычыталі, што незадоўга перад канцом сьвету, які ўжо блізка, воды Мёртвага мора закіпяць ад рыбы.

# Зьбігнеў Бжазінскі:

## Украінцы, беларусы, чачэнцы маюць права жыць ва ўласных дзяржавах

**Украіна можа зрабіцца сябрам NATO і ЭЗ, а можа ператварыцца ва ўскраіну Расеі. Так лічыць Зьбігнеў Бжазінскі — цяпер прафэсар унівэрсытэту імя Джонза Гопкінса, а ў 1977—81 г. дарадца прэзыдэнта ЗША Джымі Картэра па пытаньнях нацыянальнай бясьпекі. Ад чаго залежыць рэалізацыя гэтых сцэнароў, Бжазінскі расказаў у інтэрвію ўкраінскаму часопісу “ЄвроАтлантика”.**


WWW.JEDINAK.CZ

**— Каго, на ваш погляд, нагадвае Ўкраіна на сусьветнай шахматнай дошцы? Пешку, каня, ладзьдзю?**

**Зьбігнеў Бжазінскі:** Хутчэй слана. Яна рухаецца па простай лініі то наперад, то назад. Слон — гэта важная фігура. Але не такая ўплывовая, як іншыя ўдзельнікі гульні на шахматнай дошцы.

**— Якое месца вы адводзіце Ўкраіне на сёньняшняй і заўтрашняй геапалітычнай карце Эўропы?**

**З.Б.:** Украіна зробіцца або важнай краінай ва ўнутранай сыстэме эўрапейскай супольнасьці, або — большая частка яе тэрыторыі — расейскай пэрыфэрыяй. Выбар залежыць ад волі ўкраінцаў. Менавіта яны маюць сілу і магчымасьці вырашаць, якая будучыня чакае Ўкраіну.

**— Ці напраўду ЗША “здаюць Украіну Расеі”, як пішуць некаторыя крыніцы краін NATO?**

**З.Б.:** Вядома, ЗША ня бачаць Украіну часткай расейскай сфэры ўплыву. ЗША хочуць падтрымліваць добрасуседзкія адносіны з Расеяй. Але ЗША адначасова прызнаюць стратэгічную важнасьць існаваньня незалежнай Украінскай дзяржавы.

**— Наколькі рэальна Ўкраіне ўступіць у NATO да 2017 году, калі Чарнаморскі флёт Расеі павінен быць выведзены зь Севастопалю?**

**З.Б.:** Украіна здольна зрабіцца сябрам і NATO, і Эўрапейскага Зьвязу. У яе ёсьць неабходны патэнцыял. Калі яна сапраўды прагне сяброўства ў NATO ды Эўразьвязе, дык можа набыць яго значна раней за 2017 год.

Далучыцца да NATO лягчэй. Для гэтага неабходна зьдзейсьніць менш фундамэнтальных зьменаў у прыродзе грамадзка-палітычнай сыстэмы Ўкраіны.

**— А якія перспэктывы ў Масквы на сусьветнай шахматнай дошцы?**

**З.Б.:** Перад Расеяй паўстала дылема: ці зрабіцца ў будучыні часткай супольнасьці пад назвай Шырокая Эўропа, ці ўшчыльную сутыкнуцца з усё сур’ёзнейшымі выклікамі тэрытарыяльнай цэласнасьці краіны.

Гэты выклік віруе на перанаселеных тэрыторыях, дзе жывуць каля чатырох мільярдаў кітайцаў, індусаў і мусульманаў. Яны суседзяць зь дзьвярыма, што вядуць да спакусьлівых багацьцяў Сібіру.

Урэшце, у будучыні Расея павінна далучыцца да Эўропы. Аднак, каб зрабіцца часткай Эўропы, яна мусіць узьняцца да ўзроўню сапраўднай эўрапейскай дзяржавы.

Кажучы іншымі словамі, Расейская Фэдэрацыя павінна быць дэмакратычнай дзяржавай, якая не прыгнятае іншых нацыяў. Украінцы, ці беларусы, ці чачэнцы маюць права жыць ва ўласных дзяржавах, таму што эпосе імпэрыяльнага каляніялізму надышоў канец.

**— Парадаксальна, што Джордж Сорас крытыкуе глябальны капіталізм. Ці не дублюе Ўкраіна лацінаамэрыканскага шляху? Як выглядае яе мадэль з пункту гледжаньня вашай знакамітай тэорыі канвэргенцыі?**

**З.Б.:** Галоўная праблема, што стаіць перад Украінай, — недахоп глыбока ўкарэненага нацыянальнага ўсьведамленьня грамадзянскай адказнасьці. Гэта стрыжнёвая праблема, зь якою краіна апынулася сам-насам.

Большасьць лідэраў Украіны ня толькі нічым не ахвяравалі дзеля нацыянальнай незалежнасьці, але нават і ня прагнулі яе. Шмат хто ставіцца да яе як да магчымасьці ўзбагачэньня. А гэты фактар ня мае ніякіх адносін ні да “глябальнага капіталізму”, ні да “канвэргенцыі”.

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Франц Субель**

ЭЎРАІНТЭГРАЦЫЯ: ПОГЛЯД З ПОЛЬШЧЫ

# Людзі мяняюць прафэсіі кожныя некалькі гадоў

На сёньня працы ня маюць 17,6% палякаў. Гэта значыць, што ад пачатку 2003 г. колькасьць беспрацоўных у Польшчы зьменшылася на 118 тыс.

“Але ўсё адно іх тры мільёны, — кажа дырэктар Дэпартамэнту рынку працы Міністэрства эканомікі, працы й сацыяльнай палітыкі **Цэзары Міжаеўскі.** — Зь іх паўтара мільёна бяз працы ўжо год. Каля мільёна не працуюць больш за два гады. У Польшчы багата асобаў зь нізкімі кваліфікацыямі, высокі паказьнік беспрацоўя і сярод моладзі. І, нарэшце, на польскім рынку працы існуюць выразныя рэгіянальныя дыспрапорцыі”.

**— У чым прафэсійныя й рэгіянальныя дыспрапорцыі на польскім рынку працы?**

**Ц.М.:** Дастаткова параўнаць Мазавецкае ваяводзтва, дзе найніжэйшае беспрацоўе (Варшава — 6%), з рэгіёнамі, дзе яно складае 30—40%. Трэба вярнуць беспрацоўных грамадзтву. Бо падрастаюць ужо чарговыя пакаленьні беспрацоўных. Калісьці гаварылі, што на Захадзе людзі застаюцца бяз працы нават у трэцім калене. Цяпер падобная сытуацыя назіраецца і ў Польшчы. Асабліва ў рэгіёнах былых дзяржаўных сельгаспрадпрыемстваў. Другая праблема — дэмаграфічны пік, беспрацоўная моладзь. Для яе ўрад падрыхтаваў праграму “Першая праца”. Чалавек, які губляе працу ў 50 гадоў, таксама зь цяжкасьцю знаходзіць сваё месца на рынку. Асобнай праблемай зьяўляецца таксама пытаньне жанчынаў на рынку працы. Беспрацоўе і палярызацыя рынку працы будзе ў Польшчы цягам найбліжэйшых дзесяцігодзьдзяў адной з самых сур’ёзных грамадзкіх праблемаў.

**— Што ж рабіць палякам?**

— Пастаянна вучыцца. Трэба будзе часьцей зьмяняць прафэсію, каб знайсьці працу. Гаворка ня толькі пра маладых, але й пра старэйшых. На Захадзе людзі мяняюць прафэсіі кожныя некалькі гадоў, бо гэтага патрабуе рынак працы. Многія палякі выхоўваліся ў невялікіх мястэчках, дзе ўсе вучыліся ў адной школе, атрымлівалі працу і рабілі яе да пэнсіі. Гэткія часы мінулі.

Віцэ-міністар эканомікі, працы і сацыяльнай палітыкі **Марак Шчапаньскі** кажа, што пасьля застою, які назіраўся ў 2000 г., выдаткі на актыўную частку фонду працы паступова павялічваюцца. Сёлета гэта больш за 300 млн даляраў.

**— Існуе погляд, што беспрацоўе — гэта спадчына камунізму. Якія прычыны згаданай зьявы бачыце Вы?**

**М.Ш.:** Прычынаў шмат. Ад празьмернага працаўладкаваньня на многіх прадпрыемствах за сацыялізмам да дэмаграфічнай сытуацыі — ужо некалькі гадоў запар у Польшчы больш за 600 тыс. асобаў узрастаюць у дарослае жыцьцё. Да гэтага трэба дадаць сытуацыю ў сусьветнай і эўрапейскай эканоміках.

**— Ці паўплывае працэс рэструктурызацыі польскай эканомікі на рынак працы Польшчы? Якім галінам прамысловасьці, якім прафэсіям пагражае найбольшая небясьпека?**

— У Польшчы працэс найбольш балючых структурных пераўтварэньняў ужо скончаны. Цягам апошніх гадоў абмежаваньне працаўладкаваньня ў горнай, мэталюргічнай, вайсковай прамысловасьцях было даволі вялікае. Цяпер гэты працэс выразна запаволіўся. Колькасьць працоўных месцаў зьмяншаецца на асобных прадпрыемствах, якія не даюць рады ва ўмовах рынкавай эканомікі. Цяпер трэба разьлічваць на тое, што фірмы, добра падрыхтаваныя да інтэграцыі з Эўразьвязам, пачнуць разьвівацца і ствараць новыя месцы працы.

**— На якую сацыяльную дапамогу могуць разьлічваць асобы, што застануцца бяз працы?**

— Гэта залежыць ад сэктару прамысловасьці. Кожная асоба, звольненая з ініцыятывы прадпрыемства, мае права на кампэнсацыю. Некаторыя галіны прамысловасьці (напрыклад, горная й мэталюргічная) дабіліся больш карысных кампэнсацыяў ці сацыяльных гарантый.

Цяпер урад стараецца дапамагчы меншым гарадам ці мясцовасьцям, дзе банкрутавала вялікае прадпрыемства. Гаворка ня йдзе пра тое, каб інвэставаць у кампэнсацыі. Урад хоча інвэставаць у разьвіцьцё малых і сярэдніх фірмаў, якія павінны ствараць новыя месцы працы.

**— Ці польскія працоўныя выйграюць ад далучэньня краіны да ЭЗ? Якія шанцы яны маюць на эўрапейскім рынку працы?**

— На жаль, толькі частка краінаў Эўразьвязу згадзілася поўнасьцю адкрыць свае рынкі працы для палякаў. Паводле ўрадавых ацэнак, штогод ня больш як 500 тыс. палякаў спрабуюць знайсьці працу ў эўразьвязаўскіх краінах — гэта прыблізна столькі, колькі цяпер у рамках сэзонных работ працуюць у ЭЗ. Галоўным жа шанцам для Польшчы зьяўляецца разьвіцьцё эканомікі. Таксама сродкі з эўразьвязаўскіх структурных фондаў даюць шанец на павелічэньне ўзроўню інвэстыцыяў і памеру сродкаў, выдаткаваных на актыўную палітыку рынку працы.

**— Апошнім часам гаворка йдзе пра “мабільнасьць” на рынку працы. Ці палякі гатовыя на зьмену спосабу жыцьця?**

— Справа ня толькі ў гатовасьці пераехаць у іншае месца, але таксама ў жытле. З гэтай прычыны ўрад не спадзяецца, што пасьля далучэньня Польшчы да Эўразьвязу адбудзецца нейкая асаблівая міграцыя працоўных між рэгіёнамі краіны.

**Паводле беларускай службы радыё “Палёнія”**

# П’еса для здаровых

**Сэзон у Тэатры-студыі Акадэміі мастацтваў адкрыўся незвычайным спэктаклем. Студэнт-дыплёмнік тэатральнага факультэту Анатоль Коц і выкладчыца сцэнічнай мовы Ірына Кабанава разыгралі перад узрушанай публікай п’есу польскага драматурга Інгмара Вількіста «Ноч Хельвэра». Паставіў яе Аляксандар Гарцуеў.**

Сваю першую п’есу «Оскар і Рут» Вількіст напісаў у 1998 г. За пяць гадоў яго драматургія ў Польшчы набыла статус культавай. У адным з найлепшых тэатраў краіны — познанскім «Тэатры Польскім» — ідуць цяпер тры п’есы Вількіста, яшчэ дзьве рыхтуюцца. Адна-дзьве яго п’есы ёсьць у рэпэртуары кожнага польскага тэатру.

Публіка ведала, што Інгмар Вількіст — гэта псэўданім, аднак доўгі час не здагадвалася, хто за ім хаваецца. Сёлета аўтар вырашыў раскрыцца. Сапраўднае яго імя — Яраслаў Сьверш, гэта вядомы гісторык і крытык сучаснага выяўленчага мастацтва, намесьнік дырэктара прэстыжнай варшаўскай галерэі «Zachęta». Ён літаральна пераклаў сваё імя на старажытнаскандынаўскую. «Інгмар» — тое ж, што «Яраслаў». (Інг, як і Ярыла, — гэта боства пладнасьці, а «-мар» («maerr») азначае «слаўны».) Сьвершч — па-беларуску цвыркун. А па-нарвэску — villqist.

«Ноч Хельвэра» сталася ў польскім тэатры сэнсацыяй. Не прайшло й году пасьля прэм’еры, як п’еса паўстала перад гледачамі ў форме тэлеспэктаклю. Гэты жанр ня менш папулярны цяпер на польскім ТБ, чым быў у нас за савецкім часам. У верасьні 2001-га «Ноч Хельвэра» прывезьлі ў Берасьце на тэатральны фэст «Белая вежа». Катажына Вэнгліцка — выканальніца ролі Карлы — была ўганараваная галоўным прызам за акторскую ігру.

У Беларусі п’есай Вількіста зацікавіўся толькі Магілёўскі абласны драмтэатар, што ў Бабруйску, ды рэжысэр Гарцуеў. «Ноч Хельвэра» ў варыянце бабруйцаў можна было ўбачыць сёлета ў чэрвені на сцэне менскага Расейскага тэатру. Квіток каштаваў усяго пару тысячаў, але нязручны час першых водпускаў і апошніх экзаменаў ды сталічны снабізм перашкодзілі менчукам ацаніць бабруйскую пастаноўку.

Інача сталася з спэктаклем Гарцуева. Адна з прычын — менавіта Гарцуеў прэтэндуе сёньня на ролю лідэра, якую ў пагоні за камэрцыйным посьпехам незаўважна і неабачліва страціў Мікалай Пінігін.

Гарцуеў дваццаць з гакам гадоў працаваў акторам у Купалаўскім тэатры. Дыяпазон яго роляў — ад парадыйнага Банавэнтуры Выкрутача ў «Ідыліі» да змрочнага Рыцара ў «Касьцюмэры». Спэктаклі, зь якімі Гарцуеў прыйшоў у рэжысуру, вылучаюцца сьпелым прафэсіяналізмам, гармоніяй задуманага і выяўленага. У 1994-м быў «Чорны квадрат», у 1996-м — «Крывавая Мэры», потым — «Трышчан і Іжота», «Саляміэя», «Брат мой, Сыман». Ходзяць пагалоскі, быццам Гарцуеў узначаліць Тэатар беларускай арміі. Але пры кожным раскладзе ён назаўжды застанецца купалаўцам, роўна далёкім і ад пустой камэрцыйнасьці, і ад драпежніцкай эксплюатацыі акторскай прыроды. Ад усяго, што робіць тэатар нікчэмным і танным.

Аднак нават імя Гарцуева на афішы не прыцягнула б да «Ночы Хельвэра» столькі ўвагі, калі б ня моцная падтрымка з боку Польскага інстытуту. Гэтай пастаноўцы быў нададзены спэцыяльны рэклямны акцэнт: гэтай прэм’ерай распачаўся чатырохмесячны фэст «Восень з польскай культурай’2003».

Такім чынам, спэктакль. Карла — саракагадовая кабета, калісьці каханая і шчасьлівая ў шлюбе. Аднак ейнае шчасьце было разбуранае нараджэньнем «дэфэктыўнай» дачкі. Употайкі Карла занесла яе на ганак дзіцячага прытулку. Гэтае злачынства зруйнавала ўсё яе жыцьцё, аднак дапамагло ўсьвядоміць, які гэта страшэнны грэх — дзяліць людзей паводле іхнае «паўнавартасьці» і любіць толькі здаровых ды прыгожых. Пасьля няўдалых спробаў адшукаць дачку яна ўзяла з прытулку іншае дзіця і вырасьціла яго. Хельвэр — алігафрэн, ён ніколі не стане такім, як іншыя людзі. Менавіта з гэтай прычыны ён больш за ўсё на сьвеце хацеў бы маршаваць у калёне, дзе ў людзей няма твараў, а ёсьць толькі агульная воля, якая сьцірае паміж імі ўсялякую адрознасьць. Ён ня здатны зразумець, што гэтак маршуюць ягоныя забойцы — фашысты, у якіх адзіная мэта — фізычна зьнішчыць усіх адрозных, каб не псавалі расы і ня елі хлеба. А вось Карла цудоўна разумее, што ім абаім ужо вынесены сьмяротны прысуд. Ёй — бо габрэйка. Яму — бо алігафрэн. І прысуд будзе выкананы сёньня ўначы, бо ўва ўсім квартале рабуюць крамы, кватэры, забіваюць людзей... Карла спрабуе выратаваць Хельвэра, дае яму грошы і выпраўляе на вакзал. Але дарэмна. І тады Карла труціць яго псыхатропнымі пігулкамі. Каб толькі не аддаць на ганьбаваньне зьвярам, тупат якіх ужо чуваць за дзьвярыма.

Шкада, што ў кароткім анонсе, які распаўсюдзіў з нагоды Польскі інстытут, аказалася столькі памылак. Адтуль яны трапілі ў прэсу і галовы гледачоў, пашкодзіўшы ўспрыманьню спэктаклю. Прыкладам, напісана ў анонсе, што аўтар «упарта хавае» сваё сапраўднае імя. І глядач падсьвядома шукае ў п’есе прыкметы літаратурнае містыфікацыі. Сапраўднай жа памылкаю сталася фальшывая зьвестка, быццам «Ноч Хельвэра» пры першай сваёй пастаноўцы ў ліпені 2001 году называлася «Entartete Kunst» («Зьвыроднае мастацтва»). «Entartete Kunst» — гэта зусім іншая п’еса з трынаццацьцю пэрсанажамі. Назва «Зьвыроднае мастацтва», прыкладзеная да «Ночы Хельвэра», забівае сэнс трагедыі на сцэне. У тым самым анонсе чытаем: «Галоўнай тэмай «Ночы Хельвэра» сталі нездаровыя эмацыйныя саюзы, дзе супрацьлеглаcьці і адрозьненьні схаваныя за звычайнай рэчаіснасьцю» (?!).


Аляксандар Гарцуеў

Гэта асабліва б’е па маладой публіцы, якая не заўжды здольная глядзець сваімі вачыма. «Што гэта?» — піша ў «Белорусской газете» пад пакласьнай назвай «Прости меня, мама, хорошего сына…» тыповы прадстаўнік гэтай публікі Андрэй Курэйчык. —– Даволі дэпрэсіўная псыхалягічная драма ў тыпова эўрапейскім стылі. Сын-дэгенэрат (Хельвэр) цягам усяго спэктаклю разнастайнымі спосабамі зьдзекуецца з мамы, якая (…) урэшце не вытрымлівае, спрабуе выправіць яго ў клініку, а потым атручвае яго лекамі. (…) Шмат крыку, любові, нянавісьці, жорсткасьці, жалю, а дзеля чаго…»

І гэта нягледзячы на тое, што Гарцуеў і ягоныя акторы з надзвычайнай дакладнасьцю выявілі сэнс гэтай трагедыі.

Першае, што бачыш на сцэне, — гэта жытло. Але жытло прывіднае, няўтульнае, шэрае, адкрытае бязьлітасным вятрам гісторыі. Інакшай адкуль гэтыя абрыўкі газэтаў, якія тоўстай варствою ўкрываюць і падлогу, і стол, вісяць на жырандолі? Абрыўкі газэтаў — як абрыўкі нікому не патрэбных слоў, зь якіх складаецца любая прапаганда. А ў цэнтры гэтага хаосу — старэнькае радыё. У спэктаклі радыё іграе толькі музыку, хоць Карла асьцерванела круціць рэгулятар, відавочна спадзеючыся пачуць нешта іншае — нейкі голас вызваленьня.

Музыка, што гучыць па радыё, — Вагнэр, Моцарт («Чарадзейная флейта», а ў фінале — «Рэквіем») і песьня «Mutter» гурту «Rammstein». Песьня невыпадковая хоць бы таму, што гэты гурт вінавацяць у прапагандзе ідэяў нэафашызму. Яе тэкст утварае сабой змрочна сугучны кантрапункт да сцэнічнае дзеі:

«...Мне не далі цыцкі,
Не далі шчыліны, каб схавацца.
Ніхто ня даў мне імя,
Мяне зачалі ў мітусьні і бязь семя.
Маці, якая мяне ніколі не нараджала, —
Я прысягнуў сёньня ўначы:
Я падару ёй хваробу,
А потым утаплю ў рацэ.
Маці! Маці!
У ейных грудзях жыве зьмяя.
У мяне на лбе радзімка —
Зьнішчы яе пацалункам нажа,
Нават калі гэта мяне заб’е.
Маці... Маці! Маці?
Маааааааммааааааааааааааааааа!!!!»

«Rammstein» — гэта масток між Моцартам і гукамі пагрому — тупатам, крыкамі, звонам пабітага шкла. «Крышталёвая ноч» — вось што адразу ўзьнікае ў сьвядомасьці, калі чуеш гэтыя гукі. Хоць грошы, якія Карла дае Хельвэру, называюцца ня маркі, а кроны. А значыцца, дзея магла адбывацца ў Чэхіі, Славакіі, Швэцыі, Нарвэгіі, Эстоніі, Аўстрыі, Вугоршчыне, але толькі не ў фашыстоўскай Нямеччыне. Не было ў 30-я і псыхатропных пігулак.

З дапамогаю гэткіх дробных дэталяў аўтар дае зразумець, што гаворка ідзе не пра гістарычныя падзеі, а пра тое, што можа здарыцца, калі нам ня хопіць пільнасьці своечасова ўгледзець фашысцкую небясьпеку. Небясьпеку фашызму «індывідуальнага», калі маці пазбаўляецца ад дзіцяці, бо яно не падобнае да іншых, — і фашызму грамадзкага.

Фашысты — гэта не абавязкова малойчыкі ў чорных кашулях, якія маршуюць па вуліцах і крычаць «Хайль Гітлер!». Гэта могуць быць элегантныя маладыя людзі з унівэрсытэцкімі дыплёмамі, якія спавядаюць ідэю «мадэрнізацыі пакаленьня». А таксама тыя, хто заклікае «пагалоўна расстрэльваць» алькаголікаў, наркаманаў і крымінальнікаў. А таксама тыя, хто занадта турбуецца пра «здароўе, інтэлект і маральнасьць нацыі». Апошняя асабліва небясьпечныя, бо любяць разважаць пра «зьвырадненьне», якое нібыта выяўляецца ў колькасьці разумова адсталых, хворых дзяцей. Нібы гэтыя дзеці — нейкія адкіды, якія выклікаюць у «нармалёвых людзей» толькі агіду.

У пачатку 1939 г. усе радзільні ў Нямеччыне атрымалі загад дасылаць справаздачы наконт нараджэньня хворых дзяцей. Псыхічна хворых забівалі й на акупаваных тэрыторыях. У Кіеве яшчэ ўвосень 1941 г. былі пагалоўна зьнішчаныя пацыенты буйной псыхіятрычнай клінікі імя Паўлава. Падобна, такі ж лёс спаткаў і пацыентаў менскага Другога клінічнага гарадка (так называўся ў той час 2-і клінічны шпіталь). Перад вайной 400 з 630 ложкаў там прызначаліся для псыхіятрычных пацыентаў. У першыя дні акупацыі на тэрыторыі 2-га клінічнага гарадка ўтварылі канцлягер, неўзабаве цалкам ліквідаваны. Пра лёс псыхічна хворых падчас другой сусьветнай вайны беларуская гістарыяграфія маўчыць. Як быццам яны й напраўдзе нейкія недачалавекі.

Вількіст сваёй п’есай хацеў нам сказаць, што ўсе мы — здаровыя і хворыя — аднолькава людзі. І калі мы гэтага своечасова не ўсьвядомім, дык усе загінем. Асобісты грэх фашызму вылечваецца прасьвятленьнем, вяртаньнем да Бога, абуджэньнем сэрца, здольнага да любові і дабрыні. А вось супольны грэх фашызму лепей папярэджваць прышчэпкамі добрага мастацтва, бо нават цана ў мільёны чалавечых жыцьцяў не засьцерагае ад рэцыдываў. На жаль, большасьць з тых, каму было прызначанае гэтае пасланьне, яго не зразумелі, схаваўшыся за собскім эстэцтвам і модай на псыхапаталёгію. Хоць акурат псыхапаталёгіі ані ў п’есе Вількіста, ані ў спэктаклі Гарцуева не было ні кроплі.

**Юлія Андрэева**

Прысьвячаю тэкст памяці пацыентаў Рандзілаўшчынскага псыханэўралягічнага дому-інтэрнату.

---

Рэдакцыя “Нашай Нівы” рыхтуе традыцыйны спэцыяльны нумар **“Сем апавяданьняў на сем калядных вечароў”**. Сардэчна просім празаікаў і перакладчыкаў дасылаць і даносіць нам свае творы.

---

УПЕРШЫНЮ Ў МЕНСКУ

# Пабыць богам

Даўно мінулі часы, калі Госпад Бог асабіста спускаўся на Зямлю і гутарыў з простымі сьмяротнымі накшталт Майсея. Але і ў нашы дні ў вас ёсьць шанц сустрэцца з Усявышнім. Калі ўсе беды ўваднчас абрынуцца на вашу галаву, жыцьцё канчаткова страціць кайф і вы абвінаваціце Бога, што той проста зьдзекуецца з вас, — вось тады, можа, Госпад і выдзеліць вам некалькі дзясяткаў хвілін з свайго неабмежаванага ліміту. А можа, нават дасьць магчымасьць перакананца, як “цяжка быць богам”, уручыўшы на тыдзень свае паўнамоцтвы. Прынамсі, так адбылося з Брусам Ноланам, звычайным тэлерэпарцёрам, які марыў усяго толькі пра пасаду вядучага на сваім канале.

На жаль, як вы ўжо здагадаліся, такое магчыма толькі ў кіно, а калі дакладней — у новай амэрыканскай камэдыі “Брус Усёмагутны”, якая на гэтым тыдні выйшла на менскія экраны. Праўда, у фільме ёсьць адзнакі і іншых жанраў — і мэлядрамы, і нават фантастыкі.

Галоўныя ролі ў фільме выконваюць зоркі Галівуду Джым Керы і Морган Фрымэн. Спачатку некалькі слоў пра апошняга, бо менавіта ён грае Бога. Госпад у ягоным увасабленьні выходзіць што трэба: абаяльны, аўтарытэтны, гатовы зразумець і падтрымаць — проста-такі ідэальны псыхатэрапэўт.

Джым Керы на ўсю моц дэманструе свой талент коміка. Ён змушаны быў вярнуцца да гэтага жанру пасьля таго, як яго апошняя драматычная праца (“Маджэстык”) праваліліся ў пракаце. І пацэліў у кропку — “Брус Усёмагутны” некалькі разоў акупіў сваю вытворчасьць толькі падчас паказу ў ЗША.

Закранаючы такую далікатную сфэру, як вера, аўтары фільму здолелі “захаваць баланс”, таму ступень вашай рэлігійнасьці на ўражаньні ад фільму не паўплывае. А акцэнт на магчымасьцях, стоеных у самім чалавеку, зрабіў бы пракат стужкі мажлівым, відаць нават у СССР.



Фільму не псуе некаторы дыдактызм, які заўважна нарастае ў фінале. Бо ўсё-такі сваю асноўную задачу — разьвесяліць вас — “Брус Усёмагутны” выканае.

**Іван Пятроў**

# “Каза” на рагах

Працяг са старонкі 1.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Лявон Вольскі быў усім?

Сьвята “Крамбамбулі” пачалося з “Паўлітра добрага настрою” — Вольскі яшчэ раз выявіў сваю здольнасьць пераўвасабляцца і разам з заляй падарожнічаў па розных краінах ды напоях. Падчас музычнае вандроўкі ў Італію на сцэне зьявілася салістка Опэры Ніна Цішко — іх дуэт зь Лявонам (а-ля Фрэдзі Мэркуры — Мантсэрат Кабальe) выклікаў фурор.

Часткай шоў стаўся і выступ старшыні Смалявіцкага райвыканкаму Мікалая Неўмяржыцкага. Ён выйшаў да мікрафона разам з дырэктарам “БелПІ” Сяргеем Дайнэкам і пачаў распавядаць, які ўнёсак зрабіла фірма ў бюджэт Смалявіч. Сам Дайнэка прамовіў больш палымяна: “Мы — беларусы, і павінны гэтым ганарыцца”. Потым зайгралі “Савецкае шампанскае”. А пасьля выкананьня “Тэкілы” вядучы канцэрту Аляксандар Памідораў пачаў страляць у лідэра “Крамбамбулі” зь пісталета — дзякуй Богу, зброя была цацачная і Вольскі ўваскрос, каб прэзэнтаваць у другім аддзяленьні “Крамбамбулю 1 1/2”.

Пасьля антракту адбылося вяртаньне на Радзіму Сяргея Міхалка — яго сустракалі хлеб-сольлю. Лідэр “Ляпісаў” на праяву такой павагі да сваёй асобы адказаў, што вывучыў па-беларуску колькі словаў кшталту “мэнтальнасьць”, “сьвядомасьць”, “зэдлік” і “чотка”. Таксама ён, падчас імправізаванай разборкі між каралямі розных раёнаў, паведаміў усёй залі і сваім калегам, што “знае Бураціну”.

Сваю справу зрабіла радыёраскрутка песьні “Госьці” — яе прымалі цяплей за астатнія. Фурор выклікала і песьня “Няма”: Міхалок у чырвоных спартовых нагавіцах сьпяваў, а вакол яго танчыла прыгажуня-балерына. Упершыню выканалі “Бэлю” — беларускі варыянт усім вядомай “Belle”: Кулінковіч іграў гарбуна, Міхалок — сьвятара, Вольскі — жаўнера. Выглядала ўсё досыць камічна. “Крамбамбуля” прайшла на “ўра”.

**Сяргей Будкін**

---

Лявон Вольскі

## БЭЛЯ

Не!
Не сьціскайся так балюча, сэрца!
Мне
Ад яе няма куды падзецца.
Б'е
У вочы юнае цыганкі прыгажосьць
І працінае сэрца беднае наскрозь.
Яе сукенку, яе цела, ейны рух
Убачыў я — і накавольны сьвет патух.
Я
Калі гляджу на рухі пругкія яе,
Нібыта пекла ўжо засмоктвае мяне.
О, Люцыпар, дай мне наяве, а ня ў снах
Правесьці пальцамі па ейных валасах.

Вось
Прыгажосьць — загадкавая сіла.
Ёсьць
Ў ёй сонца бляск і змрок магілы.
Лёс
Падараваў спатканьне гэта мне знарок.
Відаць, што д'ябал нам сустрэцца дапамог.
І ўжо нябёсы не такія, як раней,
І немагчыма ўжо ня думаць пра яе.
Скрозь,
Скрозь боль і страх у мроях да яе лячу.
І ў Маткі Боскай аднаго прасіць хачу:
Гатовы я усё аддаць і пасьці ніц,
Каб дзьверы сэрца Эсмэральды адчыніць.

О!
Не глядзі ты ў вочы, нібы ночы,
Бо,
Бо адразу ты яе захочаш.
Хто
Яе пабачыць, той патрапіць у палон.
І для мяне ўжо мая клятва — не закон.
Яе сукенка, нібы вогнішча, гарыць.
І не магу ні думаць я, ні гаварыць.
Сто
Разоў гатовы здрадзіць я дзеля яе,
Маё сумленьне болей рады не дае.
Не перашкодзіць ані клятва, ані страх
Сарваць мне кветку ў Эсмэральдавых садах.

Калі гляджу на рукі пругкія яе,
Нібыта пекла ўжо засмоктвае мяне.
О, Люцыпар! Дай мне наяве, а ня ў снах
Правесьці пальцамі па ейных валасах.

---

# Ёмістая проза жыцьця

Бахарэвіч А. Натуральная афарбоўка. — Менск: Логвінаў, 2003. — 228 с. 200 ас.




Бронзавы Ленін на местачковай плошчы штораніцы займаецца гімнастыкай ушу; дзесяцігадовая дзяўчынка грае на цымбалах дзяржаўны гімн; выдрэсіраваныя беларусы — “сумуючыя па волі зьвяркі” — выступаюць на арэне цырку; фальклёрны ансамбль “Яромка” гастралюе па краіне й ва ўсіх мястэчках знаходзіць Дамы культуры, як дзьве кроплі вады падобныя адзін да аднаго... Чытаць новую кнігу ляўрэата “Глінянага Вялеса” прыемна.

Апавяданьняў у зборніку сем. У параўнаньні зь першаю кнігаю Альгерда Бахарэвіча — “Практычным дапаможнікам па руйнаваньні гарадоў” — прагрэс адчувальны. Цяпер гэта ўжо ня проста добра абробленыя замалёўкі, а сюжэтныя, кампазыцыйна выверанына рэчы. “Талент заіканьня” ды асабліва “Night-clubbing” — годныя ўзоры таго, што прынята называць “ёмістасьцю мастацкага слова”.

Рэчаіснасьць ва ўсёй сваёй гідкасьці й прывабнасьці матэрыялізуецца ў Бахарэвічавых творах ня толькі праз сюжэт, але і праз мову. Аўтар гуляецца з словамі, не цураецца слэнгу ды трасянкі.

Але й гэта ня ўсё. Як і рэчаіснасьць, мастацкі сьвет Бахарэвіча шматузроўневы ды рухомы: усе асобныя дэталі можна скласьці ў ладную і, здавалася б, трывалую сыстэму. Такая “сыстэматызацыя”, а таксама новы “распад” на “элемэнтарныя часьціцы” адбываюцца ў прасторы раману “Натуральная афарбоўка”. У цэнтры твору — малады пісьменьнік-постмадэрніст, мастак-канцэптуаліст і г.д. і г.д... Ён шукае натхненьня, ходзіць па рэдакцыях, наведвае выставы, сьпісвае вершамі цэлыя сшыткі, а потым ідзе працаваць на Прадпрыемства — выводзіць “дурату” з галавы, “лячыцца не пігулкамі”, а ў “добрых, рабацяшчых” людзей.

Скарыстаўшы на “абмежаванай” прасторы 228 старонак прыём гіпэртэксту (героі апавяданьняў аказваюцца й героямі раману, хоць кожны з твораў самастойны і ясны без чытаньня іншых), Бахарэвіч дасягнуў мастацкай цэласнасьці сваёй кнігі, але пры гэтым перадаў плыткасьць цяперашняга сьвету.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Кніга Ладысева і Брыгадзіна

Ладысеў У., Брыгадзін П. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленьне дзяржаўнасьці і тэрытарыяльная цэласнасьць Беларусі (1917—1939 гг.). — Менск: БДУ, 2003.

Падручніка дзяржаўнай ідэалёгіі ўсё яшчэ няма. І манаграфія, напісаная Пятром Брыгадзіным і Ўладзімерам Ладысевым, яго не заменіць. Бо тут няма аргумэнтаў на карысьць “моцнай улады” — толькі гістарычнае дасьледаваньне беларускага руху ад Лютаўскай рэвалюцыі да пачатку другой сусьветнай вайны.

Затое ёсьць у кнізе новая дзяржаўная пазыцыя — “курс на незалежнасьць”: нездарма адзін з аўтараў быў на момант падрыхтоўкі кнігі міністрам адукацыі. Нават прыводзіцца параўнаньне пазыцыяў Аблвыкамзаху (“Беларусь — частка Расеі”) з выступам мэра Масквы Юр'я Лужкова ў 1997 г.

Калі б гэтая кніга выйшла гадоў сем-дзесяць таму — яна проста разьляцелася б з паліцаў кнігарняў. Сёньня яе наклад 500 асобнікаў, і ў кнігарні яна наўрад ці трапіць. А шкада: тут шмат цікавага ня толькі для спэцыялістаў.

**Адам Воршыч**

# Згублены архіў Арсеньневай?

На сайце litara.net зьявілася паведамленьне, што ў Амэрыцы быў страчаны архіў Натальлі Арсеньневай. Аўтар, які схаваўся пад псэўданімам “Паштовы галубок”, цьвердзіць, што каштоўныя паперы згубіліся пры перасылцы амэрыканскай поштай з Кліўленду, дзе дажывала паэтка, у Нью-Ёрк, дзе перахоўваецца большасьць архіваў беларускае эміграцыі. Невядомы аўтар вінаваціць у гэтым архівіста Рады БНР Лявона Юрэвіча, які перасылаў архіўныя дакумэнты поштай замест таго, каб адвезьці самому ці перадаць з надзейным чалавекам.

Сам Лявон Юрэвіч, зь якім скантактаваўся карэспандэнт “НН”, заначыў, што ён пра згублены архіў Арсеньневай дакладна нічога ня ведае: чуў хіба ад іншых плёткі наконт гэтага. Асобныя паперы з архіву Арсеньневай захоўваюцца ў зборах БІНіМу, дзе зь імі знаёміўся Л.Юрэвіч, працуючы над кнігай “Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі”. Л.Юрэвіч параіў дазнацца пра справу ў сына паэткі, зьвязацца зь якім пакуль не ўдалося.

**АШ**

# Астроскі не разабраўся ў сытуацыі

Абмражевич Н. Оршанская битва 1514 года: Военно-исторический аспект. — Менск: ІСПД, 2003. — 40 с.




Ці можна сабе ўявіць выдадзеную адміністрацыяй прэзыдэнта Расеі брашурку, у якой гісторыя Кулікоўскай бітвы разглядалася б з гледзішча Мамая? Або выдадзеную украінскай адміністрацыяй брашурку, дзе бітва пад Берасьцечкам аналізавалася б з польскіх пазыцый? Ды ўвогуле ці можна сабе ўявіць, каб адміністрацыя прэзыдэнта Расеі выдала кнігу пра Кулікоўскую бітву, разьлічаную на “супрацоўнікаў органаў дзяржаўнага кіраваньня”?

Брашурка Міколы Амбражэвіча састарэла як зьява яшчэ да свайго выхаду. Таму аўтарская анафэма падзеям 500-гадовай даўніны ўяўляе толькі музэйную вартасьць. (Паводле Амбражэвіча, расейскія войскі былі значна горш узброеныя, чым літоўскія: у маскоўцаў — лукі, а ў ваяроў Астроскага — гарматы — таму, маўляў, гераізм пераможцаў ня трэба перабольшваць; і было маскоўцаў не ўтрая больш за “пераважна палякаў”, а сілы былі “прыблізна роўныя”, таму зноў жа ня трэба перабольшваць значэньне бітвы; і войска Астроскага атрымала пад Воршай амаль Піраву перамогу, а сам гетман проста не разабраўся “ў вайскова-палітычнай сытуацыі таго часу”, у адрозьненьне ад сына, які пасьля пайшоў служыць у Маскву.)

**Сяргей Гезгала**

## ІНТЭРНЭТ

На прасторах Інтэрнэту зьявілася новае маладзевае выданьне пад назвай “Анціпод” (www.ancipod.by.ru). Аўтары, выхадцы зь Беларускага калегіюму, працуюць згодна з прынцыпам “Нясумныя навіны для нясумных людзей”. У №1 разьвенчваюць культ Хадановіча, круцяць слэнг, навучаюць культуры піцця. Шэф-рэдактар газэты — Ян Мацур. Сваімі цьвікамі “Анціпод” мае зрабіць тры праекты: “Падарожжы”, “Рок-н-рол на Беларусі” і “Перагледзець” (пра клясыку сусьветнага кіно).

**Сяргей Будкін**

# Менск галава — Полацак сэрца



**У сіве Полацак вярнуўся Сімяон Полацкі.** Скульптура дужа ўтульна сябе адчувае сярод палачан. Аж Ленін, які стаіць насупраць, ня вытрымаў, адвярнуўся. Менш велічны, але таксама зьмястоўны памятны знак пастаўлены літары «Ў». Здаецца, просты, а колькі сэнсу. Шкада, што ў Полацку няма помніка абаронцам нашай зямлі ва ўсе часы, ад усялякіх ворагаў. Шкада, што Полацак ушаноўвае Сьвярдлова, Сака і Ванцэці, Валадарскага, а мудрым князям ніякай пашаны.

Людцы, а можа, скінемся па рубельчыку на ўшанаваньне тых вяроў? Якія сваёй крывёй палілі полацкую зямлю.

Было жаданьне Полацак перадаць Расеі, але, дзякуй Богу, гэтага пазьбеглі. А то быў бы каюк Беларусі. Была б зямля з адміністрацыйным цэнтрам Мінск, а сэрца не было б. Полацак — места спачыну двух сьвятых, праўда, сьвятыя мошчы аднаго яшчэ на выгнаньні, а места іх — у Сафіі. Сродкі, укладзеныя ў разьвіцьцё духоўнасьці, вернуцца з прыбыткам, бо такім чынам мы адродзім нацыю, яе сьвядомасьць. Бо лядовыя палацы будуюцца за кошт усяго народу, а карыстаюцца імі абраныя. А колькі лясьне нашых грошыкаў у будаўніцтва «швайцарскай гары», штучных азёраў! Нам у першую чаргу патрэбны рэкорды ў духоўнасьці, у чалавечнасьці.

**Уладзімер Трашчанка, Маладэчна**

# Лішні замок на заходняй мяжы

**Украіна ў аднабаковым парадку ня стала ўводзіць візаў для палякаў, бо ўкраінцы ў адрозьненьне ад беларусаў разумеюць значнасьць заходніх інвэстыцыяў.** Асаблівы статус для атрыманьня візаў у грамадзян Калінінградзкае вобласьці: ім таксама, як і ўкраінцам, візы задарма. Беларускае ж кіраўніцтва, замест таго каб заахвочваць Захад, само лезе на стварэньне жорсткасьцяў у адносінах паміж нашымі краінамі.

Можна было б і ўвогуле ня ўводзіць візаў для польскіх грамадзянаў, а таксама адмяніць іх у адносінах да грамадзянаў Эўразьвязу. Апошнімі гэта было б расцэнена як крок да паляпшэньня адносінаў. Мы ж ходзім да тых, у каго хочам нешта прасіць, а не яны да нас.

Я разумею, што зараз не ўвядзеш нейкіх там абмежаваньняў тыпу візаў паміж Беларусяй і Расеяй, але памежны кантроль мусіць быць. Мы губляем вельмі шмат, маючы бескантрольную ўсходнюю мяжу. Гэта і нелегальная міграцыя, якая йдзе праз Беларусь, і расейскі крымінальны капітал, наркотыкі, уцекачы, для якіх Беларусь у параўнаньні з роднымі іх краінамі — рай.

**Міраслаў Сакольскі, wp.pl**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Беларускія памежнікі бяз працы не застануцца.**

# Сьмех і грэх плянэты Дождж

Калі б да нас у дзясятых днях кастрычніка завіталі іншапляпэтнікі, то мусова назвалі б аб'ект сваіх назіраньняў плянэтай Дождж. Навальны, амаль несупынны дождж апанаваў Гомель. Ён стаў найлепшым кантралёрам добраўпарадкаванасьці гарадзкіх дарогаў і дамоў. Панаваньне вады. Ня толькі ў калюгах і выбоінах, але і проста на асфальце, які даўно кладуць у такі файны спосаб, што зьнікнуць вільгаці зь яго бывае дужа складана. Пагатоў колькасьць ліўнёвак неверагодна скарацілася. Вось і застаецца спадзявацца на сонца.

А ў дамох, асабліва шматпавярховых, апошнія дажджы наагул страху нарабілі. Цячэ практычна на любым паверсе — з падваконьняў і сьценаў. Вада знаходзіць найменшыя недаробкі нядбалых будаўнікоў. Зьяўляецца цьвіль, зь якой людзі змагаюцца як могуць. Адны цьвердзяць, што супраць гэтага насланьня дапамагае марганцоўка, іншыя прапануюць апрацоўваць зацьвілыя сьцены фармалінам. Вось, можа, і пераможаш, але ярок перамагчы расколіны, што йдуць праз цалюткі шаснаццаціпавярховік? Жанчыны плачуць.

Між тым мас-мэдыя гавораць нам пра "Чыстае неба" на суседняй Берасьцейшчыне. Вучэньні з удзелам звольненых у запас. Практыка ўзаемадзеяньня цывільных і вайсковых органаў на выпадак вайны. Прывядзеньне гарнізонаў у баявую гатовасьць. Слухаеш і дзівуешся ўсёй гэнай бравадзе. Ты ў прынцыпе за моцную беларускую армію, але навошта нам савецкі цырк? Адзін знаёмец, што нядаўна прыйшоў на "дэмбэль", увогуле зьбянтэжыў. Апошні год ім даўдонілі пра зусім іншую тактыку вайны ў беларускіх умовах. Ніякіх разгортваньняў вайсковых часьцей — у кожны раён гораду, як на той восеньскі кірмаш, мусіць прыбыць колькі КамАЗаў, наладаваных "калашамі" і боезапасамі да іх. Дабро гэта раздадуць на рукі жыхарам. І ўсё. Як прыходзілі к нам партызаны...

Што да берасьцейскіх манэўраў, дык вельмі цікавіць роля ў іх унутраных войскаў. Галоўная іх задача ў выпадку ваенных дзеяньняў — вывад зьняволеных у глыбокі тыл альбо расстрэл, калі магчымасьці для вываду ня будзе. Вось такія вясёлыя карцінкі. Сьмяшнейшыя нават за тое, што Дзень настаўніка сёлета лоб аб лоб сутыкнуўся з Днём абароны жывёлаў.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

# Азімая бульба

**Часта незаўважаная падчас капаньня бульбіна, пераляжаўшы зіму ў зямлі, увесну прарастае.** А што ж будзе, калі пасадзіць бульбу на зіму? Летась мы вырашылі паэкспэрымэнтаваць. Адвялі на гародзе «досьледную» дзялачку і пасадзілі з восені дзьве караценькія баразёнкі. У пачатку зімы далі маразы бязь сьнегу, і частка бульбы вымерзла (варта было, відаць, прыкрыць з восені лісьцем ці гноем). Тая ж, што выжыла, зь вясны прарасла. Бульбоўнік быў ня надта, і мы ўжо думалі, што нічога з нашага экспэрымэнту ня будзе. Але ўраджай прыемна зьдзівіў: пад кожным карчом было па дзесяцьпятнаццаць вялікіх даўгіх бульбінаў. Суседзі сьмяяліся, што Лукашэнка мусіць даць нам мэдаль за тое, што вывелі азімую бульбу. Зрэшты, паглядзім яшчэ, як яна будзе ляжаць.

**Асаевічы, Мядзел**

# «Потэра» па-беларуску

**Радыё «Свабода» ўзьняло цікавую тэму — «Гары Потэр» па-беларуску: ці магчымы пераклад бэстсэлеру на нашую мову.** Зьдзівіў Адам Глёбус, які сказаў: «Не, немагчыма. Гэта некамэрцыйны праект, бо чытач, што чытае па-беларуску, не чытае «Гары Потэра». А не чытае беларускамоўны чытач такой літаратуры па самай простай прычыне: няма чаго. Ці многа фантастыкі на беларускай мове? Калі падумаць, дык бязь цяжкасьці можна пералічыць усе. Вось, напрыклад, што зрабіў Адам Глёбус як літаратар і выдавец для пераадоленьня гэткага стэрэатыпу? Анічога. Чаму не разрэкламаваць сваіх «Дамавікоў», якія б мелі, як мне здаецца, камэрцыйны посьпех? Не, беларускага чытача аберагаюць ад «нізкіх» жанраў літаратуры.

Магчыма, выданьне бэстсэлеру Дж.Роўлінг зламала б гэтую непрыемную і непрывабную традыцыю. Прабіла б непрабівальны мур для маскультуры.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

**У мінулым нумары «НН» знайшлося некалькі прыкрых памылак.** Сярод іх недаравальная — сп.Солтана, грамадзкага лідэра з Івенцу, завуць Вінцэнт, а не Аляксандар. Памылка тым больш прыкрая, што мы ўжо пісалі раней уласна пра *Вінцэся* Солтана. Перапрашаем спадара Солтана і ўсіх нашых падпісчыкаў.

# Дзяржаўная ідэалёгія: абмеркаваньне на форуме

**На інтэрнэт-форуме сайту «Нашай Нівы» (www.nn.by) усчалася спрэчка пра тое, ці трэба беларускаму грамадзтву дапамагаць уладзе ствараць дзяржаўную ідэалёгію. Прапануем урыўкі з дыскусіі.**

**Карцаў**,
02.10.2003, 15:02

Лукашэнка запрасіў грамадзкасьць да распрацоўкі дзяржаўнае ідэалёгіі. Кожны мае права пакласьці свой камень у падмурак незалежнае Беларусі. Упершыню нацыянальную ідэю нам не навязваюць, а запрашаюць да ейнага стварэньня. Чым ня поле, каб выйсьці й змагчы русафілаў, якія туды ўжо кінуліся бы восы на пэрсык?

Кадраў, каб забясьпечыць ідэалягічную працу, вострa не хапае. Чаму б палітыкам, лідэрам трэцяга сэктару, нацыянальна перакананым настаўнікам, службоўцам не ўключыцца ў гэты працэс? На ўзроўні дзяржавы будуць абазначаныя толькі глябальныя моманты ідэалёгіі: падыходы да дзяржаўнае ўласнасьці і прыватызацыі, пытаньні міжнароднае палітыкі, адносіны да асобы кіраўніка дзяржавы... Але ж усё астатняе будзе кампэтэнцыяй канкрэтнага ідэоляга. Гэта ж агрмадная прастора для ўплыву на масы! Прычым уплыў гэты будзе матэрыяльна, арганізацыйна й мэтадычна забясьпечаны коштам дзяржавы. Унікальная сытуацыя. Унікальныя шанцы.

**ByNastradamus**,
02.10.2003, 22:44

Вельмі цікава, як можна — аказваецца! — проста і хутка, ды яшчэ за дзяржаўныя грошы (г.зн. за нашы падаткі...) пабудаваць, распрацаваць і данесьці да шырокіх мас насельніцтва БЕЛАРУСКУЮ дзяржаўную ідэалёгію. Засталося няшмат: падчас распеведаў пра жудаснае становішча Беларушчыны, эканоміку ў сацыялістычным ступары, амаль жабрацкае жыцьцё большасьці насельніцтва проста ня ўзгадваць пра «глябальныя моманты»: «кіраўніка дзяржавы», «падыходы да дзяржаўнае ўласнасьці і прыватызацыі», «пытаньні міжнароднае палітыкі». Сапраўды, гэта «аграмадная прастора для ўплыву на масы і на кожнага!»

Яшчэ ўзгадваецца добрая рада на гэтым жа форуме да Аксаны Новікавай: «Калі трэба, схадзіць у міліцыю. Па-беларуску прывітацца, па-беларуску размаўляць зь імі, па-беларуску падпісаць неабходныя паперы. Так будзе лепей». Наколькі я ведаю — не пайшла. Напэўна, родную мову вучыць. Марнуе «ўнікальную сытуацыю».

**Карцаў**,
03.10.2003, 12:08

Казаць людзям пра маральнасьць ува ўчынках, пра чысьціню вакол сябе, пра свабоду і недатыкальнасьць асобы, пра прыватную ініцыятыву, пра гістарычны шлях Беларусі вам ніхто не забароніць. Гэтаксама як ніхто ня змусіць вас сьпяваць гімны асабіста Лукашэнку ці Расеі.

Паспрабуйце адчуць розьніцу паміж навязваньнем камуністычнае ідэалёгіі ў Савецкім Саюзе і тым, што мы можам мець цяпер.

**ByNastradamus**,
03.10.2003, 17:34

Нават калі б і была магчымасьць давесьці падчас ідэалягічных заняткаў свае прагрэсіўныя погляды, дык успрымалася б гэта як прапаганда ЗА Лукашэнку або не ўспрымалася б увогуле. Таму, «што должнасьць абавязвае гэтак казаць». А я думаю, што Вы не хацелі б, каб лібэральныя казаньні ўспрымаліся як прапаганда Лукашэнкі. Ня трэба зьмешваць каштоўнасьці і гной...

Калі адчуваеце сілы і маеце дастаткова ведаў, каб пераконваць людзей у перавазе дэмакратычных каштоўнасьцяў, дык, можа, Вам паспрабаваць зьвярнуцца праз НДА па гранты да пакуль існых фондаў? Ня прыйдзецца пэцкацца як ідэоляг, а грашовая ўзнагарода будзе большай.

Бо адзін мой знаёмы колькі гадоў таму пайшоў працаваць у КДБ. Працаваў ён там каля году, а можа, і менш. Але яго жонка, перад тым як ён пайшоў туды, яму сказала: «Нават калі ты потым і ня будзеш там працаваць, усе сябры і знаёмыя будуць казаць: «А, гэта той, хто працуе (працаваў) у КДБ?» Так і выйшла: пах застаецца надоўга.

**Карцаў**,
06.10.2003, 12:08

Ці ня памятаеце вы, як чыталі савецкія газэты? Першай старонкі не глядзелі, пачыналі з апошняй. Гэтак і з сучаснай ідэалягічнай працай: «глябальныя» ідэі (гістарычная роля Лукашэнкі, братэрства народаў, сусьветныя змовы) адлятуць, бы лупіны, а ў галовах застанецца найважнейшае. Чаму б не скарыстацца папулярнасьцю Лукашэнкі ў пэўных катэгорыяў насельніцтва і ад ягонага імя, калі яны ўжо інакш і слухаць ня хочуць, не давесьці народу вартых думкі?

«...дык, можа, Вам паспрабаваць зьвярнуцца праз НДА» — Вось ужо дзе запэцкаюся дык запэцкаюся! Нават ня ведаю, якое гаўно лепшае: КДБ ці NGO.

У Беларусі няма ніякай дыктатуры. Ёсьць выдаткі пераходнага пэрыяду, зьвязаныя зь нялёгкім станаўленьнем дзяржаўнасьці: элемэнты аўтарытарызму, гіпэртрафаваная моц бюракратыі, нацыянальная недаразьвітасьць.

**AposhniNastradamus**,
06.10.2003, 16:42

Выбіраць паміж КДБ і NGO — гэта сьмела і пэрспэктыўна, трэба толькі самога сябе перахітрыць...

Дэмакратычным шляхам навязвайце дзяржаўную ідэалёгію другім людзям, мае дзеткі безь яе пражывуць. Можна называць Лукашэнку і пераходным пэрыядам, і цяжкасьцямі, але для мяне ён добра акрэсьліваецца словамі на Г і Д.

**Ne Nastradamus**,
06.10.2003, 22:00

«І ў КДБ бываюць выключэньні». Выключэньні бываюць ва ўсім. Іншая справа, у які бок накіравана «заканамернасьць», і велічыня імавернасьці выключэньняў зь яе.

**Бэкапс**,
10.10.2003, 12:16

Нельга гуляць паводле правілаў праціўніка. Выйграць у такой гульні немагчыма. І што такое дзяржаўная ідэалёгія ў Даніі ці Фінляндыі, якія — прыклад для нас?! Ідэалягічная кампанія — спроба задурыць людзям галовы. А дзяржаву і яе чыноўнікаў сапраўды дэманізаваць няслушна. Сваю ж галіну сячом.

**http://www.nn.by**

Сяргей Шыдлоўскі

# Асінавы кол для героя

## Мудроў-аўтар

Яго тэксты раскіданыя па перакладных анталёгіях, нулявых выпусках літальманахаў ды амбітных брашурах самвыдату. Гэта проза для прэзэнтацый, для старту. Пад заклад удзелу Мудрова ў пачынаньні адкрываюцца праекты, і запрашаецца ён не на ролю вясельнага маршалка, а дзеля чарнавой работы. Але «мэнэджэры культуры» рызыкуюць абмахнуцца, паставіўшы на Мудрова-прадукт. Гандлюе сам Мудроў, расфасаваўшы бел-рэчаіснасьць у раздроб па 20 старонак свайго ўлюбёнага апавядальнага фармату.

Мудроў — тэкставік, што рэдкасьць для краіны паэтаў-песеньнікаў. Аднак імя празаіка не атаесамляецца з вобразам катаржнай цягавітасьці. Яго тэксты паўстаюць з гульні беларускім словам, гэта не залатая руда, здабытая мазалём, а шумавіньне, зьнятае з фантастычных слоўнікаў Васта ды Станкевіча. На такой мове ніхто ніколі не размаўляў і наўрад ці калі будзе. Пачаткі яго аповедаў прыгожыя і цьмяныя, як кнігі Фолкнэра: бессэнсоўна сачыць за лёгкай іх пабудовы — яны проста прыварожваюць рытмам.

Разьвесьці «залаты мільярд» на пару «штук» — нац-ідэя апошняга дзесяцігодзьдзя. У гэтым кірунку напінаюцца найясьнейшыя глузды нацыі. З тысячы і аднаго магчымага спосабу таталітарызм — беларускі шанец зрабіць гэта прыгожа. Бракуе фактуры: лукашэнкаўская Беларусь зашэрая для шэксьпіраўскіх жарсьцяў дысыдансу. Натхняе Мудроў, які прадукуе пратэзы таталітарных пераўвасабленьняў, правяраючы сябе Альбаніяй. Атмасфэра ідэальнага лябараторнага застою ў ягоных аповедах — той жыватворны глыток таталітарызму, што неабходны для камфорту змаганьня. Толькі ці носяць змагары ў сваіх заплечніках літаратуру? Сьціпла выдадзеныя кнігі Мудрова разыходзяцца разам з фотаальбомамі выдавецтва «Беларусь» на сувэніры.

Нягоды беларускага культурніка па-свойму манументальныя, але яны «неканвэрсоўныя» — няма танкаў з чырвонымі зорачкамі на вуліцах. Беларускай рэальнасьці, трактаванай, за бракам іншага памятку, як таталітарны лад, не хапае патаснай «тэлекарцінкі». Тым важнейшае заданьне Мудрова — перакласьці тугу бульбянога поля пасьля змаганьня за ўраджай у агульназразумелы альбанізм. Выходзіць трагікамічна. А трагедыя беларускага культурніка — у патрэбе маскаваць задачы нацыянальнага вызваленьня, рамантычнае ірацыянальнае паклікаваньне, сваю неадэкватнасьць сучаснаму глябальнаму парадку за лібэральнай тэрміналёгіяй.

Беларуская мова гастрылася айцамі-пачынальнікамі на тэзах нацыянальнай рэвалюцыі. Самыя беларускія зь літаратурных жанраў — гутарка, трэнас, тэкст улёткі. Проза Мудрова ў гэтым кантэксьце контррэвалюцыйная. Але разам з тым гэта *беларускамоўная* проза — ірацыянальны занятак чалавека, што кпіць зь цябе, чытач-«змагар», і зь сябе, белпісьменьніка-«будзіцеля», — паставы маргінала з рамантычных тэкстаў пазамінулага стагодзьдзя.



АЛЕСЬ КОЗІК

• Прыгожыя і цьмяныя, як кнігі Фолкнэра, — бессэнсоўна сачыць за лёгкай іх пабудовы, — ягоныя аповеды прыварожваюць рытмам.

Мудроў «гераічнейшы» і літаратурнейшы за сваіх пэрсанажаў.

## Мудроў-пэрсанаж

Калі пішуць пра Мудрова, згадваюць рукапісны альманах «Блакітны ліхтар», надзейна згублены ў спэцсховах савецкай ахранкі, кніжку з «клёвымі сьцішаткамі» Багдановіча, выратаваную расейскамоўным школьнікам Віцем на сьметніку, жыцьцё пісьменьніка ў нямілай Расеі, «Бітлз»...

З чарговым перакладам гісторыі набываюць новыя рысы, але сам набор паказак застаецца кананічным і сьвежымі сюжэтамі амаль не папаўняецца. Большасьць іх акрэсьленая межамі 60—70-х — гэта «Партрэт мастака ў юнацтве», народжаны калектыўным сумам па беларускай біяграфіі й настальгіяй па мансардах, тым больш вострай, што мансардаў ды адмыслова-маляўнічых нягодаў у жыцьці апошніх двух пакаленьняў беларускай інтэлігенцыі не было.

Складана адшукаць першакрыніцу вандроўных літаратурных сюжэтаў. Але ў выпадку з апокрыфамі мудроўскага юнацтва адпачатку адчувалася рука невыпадковага майстра, для якога вывучэньне і стварэньне жыцьця полацкіх сьвятых — прафэсійны хлеб. У пэрыпэтыях біяграфіі Мудрова прасочваецца той пазнавальны мікст дыдактычнай прыпавесьці пра беларускае абуджэньне і побытавага анэкдоту, які характарызуе прозу Ўладзімера Арлова. Паказкі пра Мудрова — мо першы прарыў гэтага аўтара да стылістыкі сваіх позьніх эсэ. Арлоў цытуе Борхеса і Брэдбэры — фантастаў, што гулялі з рэальнасьцю. Але ані першы, ані другі так і не стварылі сюжэту, які б крочыў у жыцьцё. Арлову ў гэтым пляне пашэнціла больш.

Літаратурная кар'ера Мудрова — той выпадак, калі біяграфія пісьменьніка стала вядомай чытацкай публіцы папярэдзе яго тэкстаў. Ён мала пісаў і яшчэ менш друкаваўся, і гэта было таксама адной з цаглінаў міту. Але Мудроў як пэрсанаж аказаўся кангеніяльным аўтарам «Полацкіх апавяданьняў» і, адпрацоўваючы сяброўскія літаратурныя авансы, перарос асады багемнай легенды, што абяцала яму вабноты існаваньня раньне.

Ён актыўна друкуецца, плённа працуе, выходзяць кніжкі Мудрова. Толькі гэта частка ўжо іншага міту, што належыць ТВЛ, «сябры якога ня п'юць» і ўпадаюць пэрманэнтна ў безграшоўе, вынікам чаго зьяўляюцца дыхтоўныя андэргаўндныя выданьні, зброшураваныя ў полацкай друкарні «Спадчына Ф.Скарыны». Гэта таксама і частка асабістага міту Алеся Аркуша, ягодамага сваёй рэдактарскай учэпістасьцю і здатнасьцю «расьпісаць» каго заўгодна.

Партрэты пэўных людзей цяжка ўявіць у хрэстаматыі. Запомнілася адна зь першых сустрэч зь пісьменьнікам. Мудроў сядзеў за рэдакцыйным сталом і пры зьяўленьні ў пакоі незнаёмца прыкрыў ускудлачаную бараду «Советской Белоруссией» у інстынктыўным жэсьце легенды, што бароніць уласную недатыкальнасьць. Магчыма, мудроўская барада — накладная. Для гісторыі. Магчыма, і акуляры патрэбны, каб адбівацьзадужа цікаўныя позіркі нашчадкаў. Барада, танаванае шкло акуляраў ды «Советская Белоруссия» — інсталяцыя для школьных хрэстаматый, як Багрымава жырандоля замест партрэту. Астатняе хай дадумваюць дасьледчыкі і дамалёўваюць нядбалыя двоечнікі ў падручніках.

## Мудроў-тэрмінатар

Разам з Паўкамі Карчагінымі і Мярэсьевымі Мудроў забіў Фаўста, Дон-Жуана і Чайльд-Гарольда. Яго аповеды — гэта палянаваньне на герояў: героя-салдата («Зімовыя сны»), героя-каханка («Ведзьма»), героя-асілка («Узьлёт і падзеньне Адама Марштрупы»). Гэта сьмех, але сьмех з знакам мінусу. І толькі нечалавечаская музыка «Бітлз» і Абадзінскага дае спадзеў на іншы лепшы сьвет.

## Мудроў-юбіляр

Мудрову гэтай восеньню споўнілася 50 гадоў. Гучыць як сэнсацыя для таблёіду. З таго ж шэрагу, што і 60-годзьдзе Пола Макартні. Гэтай інфармацыі не надаеш сур'ёзнай увагі, бо магія «Партрэта мастака ў юнацтве», магія вечнай маладосьці — адзінае чараўніцтва ў нашым разваражаным сьвеце, якое працягвае дзейнічаць.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Малюнкі крэйдай

Увосень двары робяцца вясёлымі: у іх вяртаюцца дзеці. Зь летняга вясковага выраю. Або замежнага…

Назіраю, як яны цяпер захоплена малююць крэйдаю на чорнай стужцы новага асфальту пад вокнамі. Заўважыўшы блізка машыну — разьбягаюцца ва ўсе бакі! А яна коціцца няўмольна — па малюнках і нясе на шынах далей лёгкі каляровы пылок ад сьвежых дзіцячых крамзоляў. Гэта — ейная дарога, ейная прастора!.. Дзеці вяртаюцца. Малыя мастакі сядаюць на кукішкі, апускаюцца на калені і працягваюць бяскрыўдна маляваць далей — стварыць кожны свой сьветлы, ясны, гэткі «арганічны» твор. Проста пад сінім небам, сонцам. Гэта — іхны час!

Ля пад'ездаў абмяркоўваюць першыя школьныя праблемы дарослыя. Верасень заўсёды поўны слоўных баталіяў на гэтую тэму: новыя падручнікі, новыя настаўнікі, новая сыстэма адзнакаў. А дзеці?.. Яны заўсёды нейкія «вечныя» ля той дарогі. Можа, таму, што ў іх вялікія, шырока расплюшчаныя вочы — пільна глядзець вонкі, на ўвесь Белы сьвет?.. (У дарослых вочы маленькія, больш прыхаваныя ў чэрапе. Нібы асьцярожныя, ужо навучаныя ў школе жыцьця «разьведчыкі-шпіёны» на службе Асобе, індывідууму.)

Крэйда — асадкавая горная парода, мяккі белы вапняк, што ўключае ў сябе арганічныя рэчывы, абломкі ракавінак і рэшткі прасьцейшых жывёлаў, мінэралы. Можа, і нашая цывілізацыя — гарады, мястэчкі, вёскі, накрэсьленыя палі і дарогі — некаму звысоку падаецца толькі наіўнымі крамзолямі шурпатай крэйдай на чорнай стужцы ўтрамбаванага часу. Ліне моцны дождж-патоп — і зьмые іх. Назаўсёды… (А як падсохне — дзеці зноў вернуцца сюды: сьвятое месца пустым не бывае.)

Я заўважыла, што сёньня дзіцячыя малюнкі крэйдаю сталі схематычнымі і падобнымі да тэхналягічных схемаў ды выяваў на дысплэі кампутара. Такой бяды! Абы малюнкі крэйдаю не ператварыліся ў малюнкі крыўдаю.

Дзіўна, што на ноч гэтае багацьце кідаюць без належнага дагляду, адно на міласьць Прыроды.

**Людка Сільнова**

## • НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ •

**Беларуская драматургія.** Вып. 7. / Уклад. В.Валадзько. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 224 с. 800 ас.

У гэты выпуск «Беларускай драматургіі» ўвайшлі творы сучасных аўтараў — С.Бартохавай, П.Васючэнкі, В.Лапціка, А.Карэліна, В.Паніна. Прыдбаць зборнік можна ў «Акадэмкнізе». Цана 3910 руб.

**Гродна:** Фотаальбом / Склад. А.Ласьмінскі; Аўт. тэкстаў С.Куль-Сяльвестрава. — Менск: Беларусь, 2003. 3000 ас.

Ці то Горадня сапраўды самы багаты на архітэктурныя цікавосткі беларускі горад, ці то складальнікі альбому маюць выдатнае гістарычнае чуцьцё й добры мастацкі густ, але пагартаць гэтае падарункавае выданьне надзвычай прыемна.

**Казьбярук У. Францыск Скарына:** Навук.-папул. нарыс. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. 2000 ас.

Агляднае навукова-папулярнае выданьне будзе асабліва цікавым для дзетак школьнага веку.

**Лінія фронту—Frontline.** — Менск: Логвінаў, 2003. — 240 с. 500 ас.



Кнігу склалі падборкі тэкстаў Віктара Жыбуля, Альгерда Бахарэвіча, Вольгі Гапеевай і інш. ды іх нямецкіх калегаў. Усе вершаваныя і празаічныя творы падаюцца па-беларуску і па-нямецку.

**Букчин С. Народ издревле нам родной: Русские писатели и Белоруссия:** Очерки. — Менск: Лимариус, 2003. — 640 с.: іл. 1100 ас.

Гэтая вялікафарматная кніга ўтрымлівае, паводле словаў аўтара, толькі нязначную частку таго, што можна распавесьці пра «асваеньне Беларусі» расейскай літаратурай. Першае выданьне нарысаў пабачыла сьвет яшчэ ў 1984 г. Другая публікацыя выйшла пры падтрымцы Расейскага фонду спрыяньня мастацтвам.

**Dziedzictwo kulturowe regionu puszczy Białowieskiej — wybrane zagadnienia: Wyniki polsko-białoruskich warsztatów inwentaryzacyjnych (lipiec 2002 r.) = Культурная спадчына рэгіёну Белавескай пушчы — выбраныя аспэкты: Вынікі польска-беларускіх інвэнтарызацыйных сэмінараў (ліпень 2002 г.)** / Pod red. H.Łapińskiej, M.Stepaniuka. — Białowieża—Kamieniuki, 2003. — 200 s.: il.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Ян Лівэй

**38-гадовы Ян Лівэй** стаў першым кітайскім касманаўтам. У



космасе ён прабудзе каля 20 гадзін, зробіць 14 віткоў вакол зямлі. Яго карабель "Шэнчжоў-5" вывела на арбіту ракета вайсковага ўзору. Кітайцам хоцькі-няхоцькі трэба шукаць новыя землі для асваеньня — ці то ў касьмічных прасторах, ці то ў суседняй Расеі.

**Рэжысэр Генадзь Мушперт** адкрыў сэзон у Гарадзенскім драмтэатры п'есай "Самотны захад" паводле Марціна Мак-Донага. Увесну яе спрабавалі забараніць за "нецэнзуршчыну". Але ніводнага "салёнага" слова з акторскіх рэплікаў Мушперт ня выкінуў, бо разам зь імі п'еса губляе жыцьцёвасьць. Затое адбыліся зьмены ў акторскім складзе — сам рэжысэр выканаў ролю ксяндза, які пры канцы п'есы топіцца ў возеры. Пастаноўка сабрала аншляг, не ў апошнюю чаргу дзякуючы скандалу, які разгарнулі вакол яе чыноўнікі ад культуры.

# Лешак Мілер

**Польскі прэм'ер Лешак Мілер** наведаў Беларусь. Як і Лёнгін Пастусяк нядаўна — зь неафіцыйным візытам. Прыяжджаў нават ня ў Менск, а ў Леніна, што на Магілёўшчыне, дзе 60 гадоў таму адбыўся першы бой новаўтворанага Войска Польскага. Ад беларускага ўраду яго суправаджаў Сяргей Сідорскі. Таксама неафіцыйна.

**Рыгор Пяткевіч** прызначаны генэральным дырэктарам піўзаводу "Крыніца" замест звольненага ў верасьні Ўладзімера Бадрова. Раней Пяткевіч быў намесьнікам прэзыдэнта "Белдзяржхарчпраму", а яшчэ раней — дырэктарам Малінаўшчызнаўскага сьпіртагарэлачнага заводу "Крышталь-2". Гэты лабіраваць інтарэсы замежных інвэстараў ня будзе.

**13-гадовая магілёўская школьніца** выпадкова застрэліла адзінаццацікласьніцу. Дзяўчаты прыбіралі лістоту ля сваёй школы №9 і знайшлі самаробны пісталет. Ён быў зараджаны. Фатальны стрэл адбыўся выпадкова. Адкуль зброя на школьным двары — невядома. Гора і адной, і другой сям'і.

# Андрэй Любчанка

**Андрэй Любчанка** з магілёўскага футбольнага клюбу "Дняпро-Трансмаш" — самы "сухі" брамнік Беларусі. У 1992 г. ён за 973 хвіліны гульнявога часу не прапусьціў ніводнага мяча. У міжнародным рэйтынгу зь пяцідзесяці брамнікаў ён заняў 34 месца. На першым — бразылец Херальда Пэрэйра дэ Матас Фільля з 1816 хвілінамі. Складальнікі рэйтынгу ня супастаўлялі ўзровень прафпадрыхтоўкі нападнікаў, зь якімі даводзілася сутыкацца брамнікам.

**Карэлу Гофману**, былому кіраўніку Цэнтральнага аддзелу сувязі, праскі апэляцыйны суд даў шэсьць гадоў зьняволеньня. У ноч з 20 на 21 жніўня 1968 г. ён на загад Масквы адключыў радыёсувязь, каб чэхі раней часу не дазналіся пра савецкую акупацыю. Ніжэйшая судовая інстанцыя дала Гофману чатыры гады турмы, але ён зьвярнуўся па апэляцыю. Пераконваў, што адключэньне радыё з інтэрвэнцыяй зьвязана не было — так, прафіляктычны начны перапынак.

**Тaіп Эрдаган,** прэм'ер-міністар Турэччыны, заявіў, што зьбіраецца пасласць войска ў Ірак, каб "стабілізаваць там сытуацыю". Напэўна, будзе зноў вайна.

**Ота Геншэ**, былы ад'ютант і давераная асоба Гітлера, памёр ва ўзросьце 86 гадоў ад сардэчнага прыступу. Пасьля савецкага лягеру ён жыў у Ломары, непадалёк ад Бону. Пахавацца ж хацеў у Бэрліне, дзе прайшлі маладыя гады.

**Галяндзкі прынц Ёган** (другі ў чарзе на пасад пасьля прынца Вілема Аляксандра), выракся трону. Укрыўдаваў на прэм'ера краіны, што выступіў супраць шлюбу прынца з праваабаронцай Мабэль Вісэ Сьміт. Нарачоная ў студэнцкія гады сябравала з вядомым гангстэрам, пасьля забітым у часе "разборкі". Нават станоўчая рэкамэндацыя Джорджа Сораса, у якога Сьміт працавала, не дапамагае: імідж дзяржавы перадусім.

**СМ**

ЗБМ "Беларускі Шлях" запрашае на падарожжа **26 кастрычніка** (нядзеля) па маршруце
**Менск — Ішкалдзь — Вольна — Сынкавічы — Слонім — Ружаны — Косава — Менск.**
**19 кастрычніка** (нядзеля):
**"Замкі Беларусі" Дуды — Іўе — Ліпнішкі — Ліда — Наваградак — Любча — Шчорсы — Мір.**
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер) Т.: 264-12-38 (Павал)

## ВЕРШ НА РАЗЬВІТАНЬНЕ

**Людка Сільнова**

### НЕ ХАПАЕ МНЕ ДЗЕДА

I.

У жыцьці маім сёньня
Толькі двое мужчын:
Гэта бацька ўсё сонны
І абуджаны сын.

Яны дом мой і дрэва,
Што лістамі шуміць,
Мае права і лева,
І чырвоная ніць...

II.

Я ня ведаю, гэта
Вынік смурных начэй:
Не хапае мне дзеда –
А ня мужа — хутчэй.

Дзеда — ветрам у вішнях,
Тварам у гладышы!..
Іншы будзе залішні,
Непадобны, чужы.

III.

Й што за сіла скавала
Гэты дзіўны ланцуг?..
Я калісьці кахала,
А цяпер не хачу.

У жыцьці маім сёньня
Толькі двое мужчын:
Гэта бацька ўсё сонны
І абуджаны сын.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віктару Мухіну** — былому белліцэісту, аўтару «Нашай Нівы», Віктару Корбуту — былому супрацоўніку радыё «Рацыя», Виктору Корбуту — автору газеты «Белорусь сегодня — это Советская Белоруссия», Вітаўтусу Карыбутасу — прыхільніку ідэі Вялікай Літвы напамін — Віця, асьцярожна, лёд!!! Трещенок

**Сяргею Балахонаву**. Вельмі падабаюцца Вашыя артыкулы. Пішыце. Чакаем

**Падчас** атрыманьня польскай візы ў консуляце РП у Берасьці былі груба парушаныя мае правы чалавека і грамадзяніна супрацоўнікам консуляту. Іван Сьвірыдзюк, Берасьцейскі р-н, в.Збунін

**Мянчук** (42/170/54) з в/а, бяз шк/зв, пазнаёмлюся з жанчынай. Магчыма стварэньне сям'і. А/с 61 220012, Менск

### КАНТАКТЫ

**Юля**, ты мая Цыпа! Цяпер пра гэта ведаюць усе! Яўген Ф.

**Студэнтка** прыме ў падарунак кампутар. Т.: 233-00-00, аб.21739. Таццяна

**21 кастрычніка** а 19.00 у ДК Менскага трактарнага заводу адбудзецца вечар Аляксея Дударава

**14 кастрычніка** 115 гадоў Язэпу Драздовічу. А 17.30 ускладаньне кветак да помніка, а 18.30 — вечарына ў касьцёле Сьв.Сымона і Алены! Сардэчна запрашаем

**Прывітаньні Лявону Вольскаму**, Піту Паўлаву ад Маладога Фронта. Калі спадабаўся круглы стол, чакаем далей

**Каб замовіць** бясплатны «Сьпеўнік Беларускі», дашліце свой паштовы адрас на akimycz@yahoo.com, ці на пэйджэр: 233-00-00, аб.1030, з пазнакай «па сьпевы». У сеціве: http://bs.studenty.org (цяпер 90 сьпеваў)

**Змагайцеся** разам з намі! Малады Фронт. Т.: 201-93-14, 755-69-90. Зьміцер

**Малады Фронт**. Збор штосераду у 19.00 на ганку Купалаўскага тэатру

**Як я** прыйшоў да Беларускай Мовы? Споведзі беларусаў: http://mova.by.ru/artykuly

**Што табе дае** Беларуская Мова? Дыскусія ў Інтэрнэце: http://mova.by.ru/artykuly

**Што ты робіш** для Беларускай Мовы? Дыскусія ў Інтэрнэце: http://mova.by.ru/artykuly

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Гарадзенская выстава** "Ў Міхельсона" (касэты, кампакты, беларускія кнігі) часова не працуе. Пры патрэбе замовы касэтаў і кампактаў у Горадні тэлефануйце 8-029-629-29-88. Працоўны тэлефон у Горадні: 96-74-78 (Андрэй Мялешка)

**«Пакаленьне Маладога Фронту»** — кніга Паўла Севярынца пра моладзь, народжаную ў 1970—85 г., на сайце www.mfront.org

*Сьвятлана й Фэлікс віншуюць Гары дарагога й любімага Пятровіча зь Юбілеем. Гары, наша Зорка*

### КАЦЯНЯТЫ

**Кацянятаў** аддам у добрыя рукі. 253-76-86 (Жанна)

### ПАСЬВЕДЧАНЬНЕ

**Згубленае** "Пасьведчаньне аб інваліднасьці" — сэрыя Ш, №85795. Хто знойдзе — зьвяртайцеся на т.: 260-87-48 (Валянцін)

### ПРАЦА

**Студэнт-завочнік** (спэцыяльнасьць "гісторыя") шукае любую працу. Т.: (8-02334) 6-74-49. Мікалай

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Магчыма рэпэтытарства. Т.: 235-18-72 (пасьля 16.00)

**Сьвядомы** беларускамоўны кіроўца з грузапасажырскім мікрааўтобусам (1 т грузу ці 8 асобаў) шукае сталую ці часовую працу. Т.: 8-029-775-46-83



# Дзень Зямлі

Міністэрства адукацыі, Міністэрства прыродных рэсурсаў і "Беларускі зялёны крыж" абвяшчаюць пра пачатак фэстывалю "Дзень Зямлі. Беларусь-2004", падчас якога пройдзе шэраг конкурсаў: малюнку і жывапісу **"Мой горад, мая вёска, мая краіна"** для дзяцей ад 4 да 18 гадоў; конкурс сярод школьнікаў на самую лепшую ідэю адраджэньня забытага помніка культуры **"Нам засталася спадчына"**; фатаконкурс **"Людзі Беларусі"** (намінацыі "Сямейны партрэт", "Аўтапартрэт", "Твары сяброў", "Людзі беларускіх вёсак"); літаратурны конкурс для школьнікаў 8—11 клясаў **"Я маю твор…"**; экалагічны конкурс **"Жывая вада"** (намінацыі "Экалёгія", "Фальклёр"); экспэрымэнтальны конкурс **"Лёс, лёсам, пра лёс…"** (удзельнікам прапануецца скласьці радавод сям'і); конкурс на самы лепшы праект краязнаўчага маршруту **"Мой край"**; а таксама экспэрымэнтальны конкурс для старшаклясьнікаў і студэнтаў на сюжэт для сцэнару дакумэнтальнага фільму, прысьвечанага настаўніку.

Работы прымаюцца **да 1 лютага 2004 г.** на адрас: "Беларускі зялёны крыж", вул.Кастрычніцкая 16/5 пакой 511, 220030, Менск. e-mail: earthday@greencross.by, кантактныя т.: (017) 227-79-54, 227-57-80

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Зычліўцу.** "НН" — магчымасьць для беларусаў рэагаваць на падзеі, прычым рабіць гэта прафэсійна і зь беларускай, а не расейскай ці амэрыканскай трыбуны. Каб Ваш голас не тануў у гармідары інтэрнэт-форумаў, каб Вашы думкі прачыталіся тысячамі, а не дзясяткамі людзей, каб яны падалі не на камень. Прычым шчасьлівая магчымасьць рэагаваць з тыднёвай апэратыўнасьцю, што нячаста здараецца ў беларускай гісторыі. Выкарыстоўвайце яе — чым наракаць на адсутнасьць перакладаў, вазьмеце і перакладзеце штосьці з нобэлеўскага ляўрэата; чым бурчэць пра тое, што пра спорт па-беларуску ніхто ня піша, пазнайцеся зь Мірным і напішэце пра яго. Вы называеце сябе інтэлектуалам. У такім разе Вы мусіце розьніцца ад неінтэлектуала працавітасьцю. Бо што ж нараканьні — іх адных мала.

**Дзянісу Т. зь Менску.** Тыя людзі, якія гавораць па-беларуску ў хаце, баяцца рабіць гэта на людзях якраз таму, што ня пэўныя ва ўласнай моўнай кампэтэнцыі.

**Уладзімеру Т. з Маладэчна.** Пра Дзень пісьменства — пазнавата.

## IN MEMORIAM



**Пасьля цяжкой хваробы ў 56 гадоў памёр Марэк Навіцкі, абаронца правоў чалавека.** Змагаўся за павагу да іх за камуністамі і за дэмакратамі, што вымагала адвагі. Быў вялікім сябрам Беларусі, і Хельсынская фундацыя правоў чалавека, якую ён узначальваў, ня раз прымала гасьцей зь Менску й Горадні. За Вас моляцца і ў Беларусі, пане Марэк.

**ЗБМ «Эўрапейскі Шлях»**
запрашае
**19 кастрычніка** ў вандроўку па
**Астравецкім раёне — беларускай Віленшчыне,**
багатай шэдэўрамі дойлідства, шыкоўнымі інтэр'ерамі храмаў, велічнай гісторыяй і сівымі легендамі.
**т.: 8-029-402-56-78**

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ______________________________

______________________________

______________________________

**Імя і прозьвішча** ______________________________

**Адрас, тэлефон** ______________________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3436. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 15.10.2003.
Замова № .
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а